Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 51 (3955)
НЯДЗЕЛЯ, 22 ЛЮТАГА 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

АРГАНІЗУЕМ МАСАВЫ СТАЛІНСКІ ПРЫЗЫЎ У КАЛГАСЫ

„Магутны калгасны сталінскі прызыў зьявіцца лепшым адказам аднаасобнікаў-беднякоў і серадняко ў на паход імпэрыялістаў супроць савецкай пяцігодкі і антысавецкіх вымыслаў аб „прымусовай“ працы ў СССР“

„ГІСТАРЫЧНЫЯ АРТЫКУЛЫ тав. СТАЛІНА І ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ ДАЛЕЙШЫ РОСТ І ЎМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСНАГА РУХУ НА АСНОВЕ ЛЕНІНСКІХ НАКАЗАЎ“,—

ПА ШЛЯХУ САЦЫЯЛІЗМУ

10 Ўсебеларускі зьезд заслухаў справаздачу ўраду.

Старшыня СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕД у сваім дакладзе разгарнуў перад дэлегатамі зьезду яркі малюнак ходу сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

Крок за крокам упэўненым поступам, пад выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у цесным саюзе і пры падтрыманьні ўсяго СССР, ідзе Савецкая Беларусь па шляху перамаганьня эканамічнай і культурнай адсталасьці, якая засталася ад царскага рэжыму, па шляху магутнага ўздыму вытворчых сіл краіны на сацыялістычнай аснове.

Пэрыод, які аддзяляе нас ад 9-га зьезду саветаў, адзначаецца новымі буйнейшымі перамогамі на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва, новым высокім уздымам творчых сіл рабочае клясы і працоўных мас БССР.

Ленінская лінія партыі забясьпечыла магутны размах індустрыялізацыі краіны, бурны рост сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, вялізарныя зрухі ў галіне культурна - нацыянальнага будаўніцтва.

Базавы лёзунг мабілізацыі мільённых мас працоўных: «Пяцігодка—за чатыры гады» — знайшоў сваё практычнае ператварэньне ў жыцьцё ў тым, што ЗАДАНЬНІ ПЯЦІГОДКІ ПЕРАВЫШАНЫ ПА ЎСІХ РАШАЮЧЫХ ГАЛІНАХ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР.

Сацыялістычная ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ зрабіла за першыя два гады пяцігодкі, якія супадаюць з пэрыядам паміж IX і X зьездамі саветаў, гіганцкі скачок наперад.

Валавая прадукцыя прамысловасьці ў 1928-29 гаспадарчым годзе дала рост на 48,6 проц., 1929-30 год паказвае яшчэ больш высокія тэмпы — 67,7 проц. Такім чынам заданьні пяцігодкі перавыкананы ў гэтых адносінах на 32,7 проц.

Моцна ўзраслі капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць, дасягнуўшы за першыя два гады 158 млн. руб. у той час, як сума ўкладаньняў НА ЎСЮ ПЯЦІГОДКУ ўстаноўлена ў 224,5 млн. рублёў. Ужо ў 1929-30 годзе новыя прадпрыемствы далі 20 проц. усёй прадукцыі, а з уводам у строй фабрык і заводаў, якія заканчваюцца ў 1931 годзе, гэта лічба будзе раўняцца 50 процантаў.

З году ў год УЗРАСТАЕ КОЛЬКАСЬЦЬ ЗАНЯТЫХ У ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ РАБОЧЫХ. Калі ў 1928-29 годзе кадры дзяржаўнай цэнзавай прамысловасьці раўняліся 38,4 тыс. чал., дык у 1931 годзе яны дасягаюць 82,3 тыс. чал., супроць 52,4 тыс. чал. паводле пяцігодкі.

Бурны рост прамысловасьці суправаджаўся і суправаджаецца няўхільным ПАЛЯПШЭНЬНЕМ МАТАР'ЯЛЬНАГА І КУЛЬТУРНАГА ЎЗРОЎНЮ РАБОЧЫХ МАС. Рост рэальнай заработнай платы, повышэньне сямейнага бюджэту рабочага, павялічэньне паступленьняў па бюджэце сацыяльнага страхаваньня з 20,3 млн. руб. у 1929 годзе да 29,3 млн. руб., у 1930 годзе, перавод па прадпрыемствах ВСНГБ 61,3 проц. рабочых на 7-гадзінны рабочы дзень і 78,3 проц.— на бесьперапынны тыдзень — вось яркія довады гэтага становішча. Фактам вялізарнейшай гаспадарча - палітычнай важнасьці зьяўляецца ПОЎНАЯ ЛІКВІДАЦЫЯ Ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, БЕСПРАЦОЎЯ— гэтага невырашальнага «праклятага» пытаньня для ўсяго капіталістычнага сьвету.

Гіганцкія тэмпы індустрыялізацыі краіны, разгорнутае наступленьне на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце, бязьлітасная барацьба з правым і «левым» апартунізмам, разгром контр - рэвалюцыйнай прышчэпаўшчыны — усё гэта забясьпечыла вялізарныя сацыяльна - эканамічныя зрухі ў галіне СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, забясьпечыла вялізарныя посьпехі ў справе яе сацыялістычнай рэканструкцыі.

У шырокіх маштабах разгарнулася ў БССР будаўніцтва САЎГАСАЎ—гэтага «станавога хрыбта перабудовы старога ўкладу вёскі». Плошча пад саўгасамі дасягнула да 1931 году 380 тыс. гэкт., супроць 115 тыс. гэкт. у 1929 годзе. Пасеўная плошча саўгасаў складае ў 1930 годзе 145 тыс. гэкт. у той час, як у 1928 годзе яна раўнялася толькі 42 тыс. гэкт. Для бягучага гаспадарчага году кантрольнымі лічбамі саўгасная пасеўная плошча вызначана ў 550 тыс. гэкт.

Апошнія два гады зьявіліся сапраўды гадамі вялікага пералому ў галіне разьвіцьця КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. Прадпасылкі, створаныя ленінскай лініяй партыі, павярнулі на шлях калектыўнага зямляробства асноўныя масы сялянства. Да сучаснага моманту пад калгасамі знаходзіцца ўжо 20 проц. ворнай плошчы, іахоп калектывізацыяй 16 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, які вызначаўся на працягу ўсёй пяцігодкі, зараз ПЕРАВЫКАНАН. Няўхільнае нарастаньне калгаснай хвалі дае цьвёрдую ўпэўненасьць у тым, што вызначаная плянамі 1931 году калектывізацыя 45 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак будзе поўнасьцю выканана.

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі адбываецца на ўсё ЎЗРА СТАЮЧАЙ ТЭХНІЧНАЙ БАЗЕ пры бесьперапынным РОСЬЦЕ ЭНЭРГЕТЫЧНЫХ РЭСУРСАЎ. Зараз у БССР працуюць ужо 793 трактары, а ў 1931 годзе, пры пераводзе на дзесяцісіпавыя, іх будзе 1.600. Усё больш пападаюць у вёску с.-г. машыны і прылады. Вялікія посьпехі ёсьць у галіне ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ. Выпрацоўка электрастанцый, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку, складае зараз 2.000.000 кілёват-гадзін у параўнаньні з 820 тыс. кпв.-гадзін у 1929 годзе.

Сур'ёзьнейшай перамогай у справе інтэнсыфікацыі сельскае гаспадаркі зьяўляюцца посьпехі, дасягнутыя на аснове росту сацыялістычнага сэктару, у галіне ВЫТВОРЧАЙ СПЭЦЫЯЛІЗАЦЫІ. Уся сельская гаспадарка БССР спэцыялізуецца ў жывёлагадоўча-ільняным напрамку, прычым у паўночнай частцы рэспублікі вылучаны 34 раёны, у якіх будзе пераважаць вытворства ільну. Уся рэшта паўднёвай часткі рэспублікі спэцыялізуецца ў напрамку інтэнсыўнай жывёлагадоўлі. 7 прыгарадных раёнаў спэцыялізуюцца ў напрамку вытворства садавіны, гародніны і сьвежых малочных прадуктаў. Апрача ільну другой тэхнічнай культурай, якая пераважна шырока культываваць у БССР, зьяўляюцца канаплі. Спэцыялізацыя будзе зьяўляцца ключом да падняцьця прадукцыйных сіл сельскай гаспадаркі, да далейшага ўмацаваньня яе сацыялістычнага сэктару.

Пэрыяд часу, які прайшоў паміж 9 і 10 зьездамі саветаў, характарызуецца вялікімі посьпехамі партыі і рабочае клясы ў галіне КУЛЬТУРНА-НАЦЫЯНАЛЬНАГА БУДАЎНІЦТВА БССР.

Выкрыўшы да канца контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм, які прабаваў нанесьці свой эрадніцкі ўдар, галоўным чынам, на культурным фронце, вядучы бязьлітасную барацьбу з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, а таксама з мясцовымі шавінізмамі, у першую чаргу з беларускім нацдэмакратызмам,—КП(б)Б цьвёрда і пасьлядоўна ажыцьцяўляе ленінскую нацыянальную палітыку, мацуе брацкае супрацоўніцтва ў будаўніцтве сацыялізму працоўных усіх нацыянальнасьцяй. Нельга асабліва не падкрэсьліць посьпехаў у справе павышэньня матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных нацменшасьцяй, у справе рашучага вызжываньня рэштак эканамічнай няроўнасьці, зьвязаных з гістарычным мінулым Беларусі.

Рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, дасягнула раду новых буйных перамог у галіне ажыцьцяўленьня беларусізацыі, разьвіцьця прапэтарскай беларускай і нацменаўскай культуры, у галіне вырашэньня асноўных пытаньняў культурнай рэвалюцыі ў цэлым. У БССР, ПЕРШАЙ у Савецкім Саюзе, уведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне. У 1931-32 годзе будзе поўнасьцю ліквідавана няпісьменнасьць сярод дарослых. Шырокім фронтам разгорнута работа па прафтэхнічнай асьвеце, а таксама ў галіне вышэйшай школы.

Вось пераможны балянс, з якім рабочая кляса і працоўныя БССР прышлі, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, да 10-га Ўсебеларускага зьезду саветаў.

Тэндэнцыя бесьперапыннага РОСТУ, ПЕРАМАГАНЬНЯ труднасьцяй, магутнага ЎЗДЫМУ вытворчае энэргіі мас— вось што чырвонай ніткай праходзіць па ўсім будаўніцтве і разьвіцьці БССР, наперакор прадраканьням апартуністаў, наперакор іх «тэорыям» аб «патухаючай крывёй».

Зьезд зьявіцца новай вехай у справе далейшай індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, ажыцьцяўленьня пэзунгу пік відацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі, у справе зжываньня тых недахопаў, якія яшчэ ёсьць у нашай рабоце.

ПАВЫШЭНЬНЕ РОЛІ САВЕТАЎ у ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі, паляпшэньне ЯКАСЬЦІ работы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, барацьба за ПРАВЕРКУ ВЫКАНАНЬНЯ заданьняў, яшчэ большае набліжэньне органаў дыктатуры пралетарыяту да патрабаваньняў прамысловасьці і калгаснага будаўніцтва, барацьба за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну і плянаў загатовак, а таксама мабілізацыі сродкаў, няўхільная ўзмацненьне АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ краіны—вось асноўныя задачы, на вырашэньні якіх зьезд сканцэнтруе ўвагу ўсіх працоўных БССР.

«Лінія партыі і саветаў—адна лінія» (Молатаў). Гэта палажэньне экрэсьлівае тыя посьпехі, якіх дасягнула БССР, гэта палажэньне экрэсьлівае далейшыя шляхі савецкага будаўніцтва.

Руйнуючы шапёнае супраціўленьне клясавага ворага і яго агентаў—апартуністаў, яшчэ шчыльней згуртоўваючы свае рады вакол ленінскай лініі партыі, рабочая кляса і працоўныя масы БССР упэўнена пойдуць па шляху вырашэньня гістарычнай задачы—завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

На мяжы з капіталістычным сьветам, які руйнуецца эканамічным ды палітычным крызісам і ўсё абвастраючайся рэвалюцыйнай барацьбой працоўных і прыгнечаных, БССР—краіна, у якой будуецца сацыялізм—была, ёсьць і будзе надзейным фарпостам Савецкага Саюзу.

Толькі пралетарская рэвалюцыя вызваліць мільённыя масы працоўных ад галечы і голаду

Усе на вуліцу 25-га лютага—на барацьбу за хлеб і працу—заклікае

адозва Ціхаакіянскага сакратарыяту прафсаюзаў

Ціхаакіянскі сакратарыят прафсаюзаў зьвярнуўся з адозвай да ўсіх рабочых беспрацоўных і працуючых краін Ціхага акіяну.

У гэтай адозьве ўказваецца, што за год беспрацоўе ўзрасло толькі ў галоўных капіталістычных краінах з 16 мільёнаў да 30 мільёнаў. У краіне «росквіту» — у ВАЗШ колькасьць беспрацоўных дасягнула 10 мільёнаў, у Нямеччыне — 5 мільёнаў, у Англіі перавалила за 2 мільёны і г. д. У рэзультаце капіталістычнай рацыяналізацыі, у рэзультаце беспрацоўя толькі ў Эўропе і Амэрыцы цэрпяць голад і галечу звыш 120 мільёнаў чалавек.

У Кітаі зараз ня менш 10 мільёнаў беспрацоўных і паўбеспрацоўных. 4 мільёны чал. памерла ад голаду ў правінцыі Гуансі, 14 мільёнаў чалавек у 70 паветах гэтай правінцыі галадае. Скарацілася на адну трэцюю частку насельніцтва правінцыі Шансі. У адным толькі павеце прадана ў рабства каля 200 тысяч жанчын і дзяўчат ва ўзросьце ад 8 да 30 год і г. д.

У Індыі шват буржуазных эканамісты лічаць колькасьць беспрацоўных у 12 млн. чал. Маленькая Карэя пад уладай японскага імпэрыялізму, задыхаецца ад галечы і голаду. Адна дзесятая частка ўсяго працоўнага насельніцтва Карэі пазбаўлена работы.. Беспрацоўе ўжо ахапіла каля 40 тысяч прамысловага пралетарыяту.

За адзін толькі год было 10 тысяч самагубстваў і сьмерцяй на глебе голаду і галечы. Узмацнілася галеча, расьце голад мільённых мас на Фармозе, на Філіпінах, у Інданэзіі і інш. краінах Ціхога акіяну.

Звыш 2 мільёнаў беспрацоўных бродзяць па вуліцах.

Ціхаакіянскі сакратарыят прафсаюзаў, адзначаючы няўхільны рост рэвалюцыйнага руху ў калёніяльных і паўкалёніяльных краінах, заклікае беспрацоўных і паўбеспрацоўных у цесным яднаньні з рабочымі, якія яшчэ ня выкінуты з фабрык і заводаў выйсьці 25 лютага на вуліцу, каб пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнага прафсаюзнага руху змагацца за свае правы. У міжнародны дзень барацьбы, — гаворыцца ў адозьве да беспрацоўных, — давядзеце, што ўсё ваша абурэньне, усю накопленую нянавісьць і баявую энэргію вы гатовы накіраваць на зьнішчэньне капіталістычнай сыстэмы і ўсіх яе прыхільнікаў.

Няхай жыве адзіны рэвалюцыйны баявы фронт беспрацоўных і працуючых!

Няхай жыве супольная барацьба рабочых мэтраполіі і працоўных калёній і паўкалёній!

Нашерад да барацьбы за хлеб і работу!

Усе на вуліцу 25 лютага!

Міжнародны камітэт для расьсьледваньня становішча палітзьняволеных у Польшы

БЭРЛІН, 17. У Бэрліне створан камітэт «для расьсьледваньня становішча палітычных зьняволеных у польскіх турмах». У склад камітэту ўвяходзяць вядомыя пева - настроеныя вучоныя, пісьменьнікі, мастакі і артысты. У асобным паведамленьні камітэт канстатуе, што жудасныя катаваньні палітзьняволеных у Луцкай турме не зьяўляюцца ізаляваным зьявішчам. Яны зьяўляюцца толькі адным са зьвеньняў у ланцугу барацьбы за фізычнае зьнішчэньне ўсіх актыўнейшых элемэнтаў нацыянальна і сацыяльна прыгнечанага насельніцтва Польшчы, што праводзіцца польскім урадам. Камітэт патрабуе дапушчэньня ў Польшчу міжнароднай камісіі для расьсьледваньня становішча палітзьняволеных у польскіх турмах.

ПАПРАУКА.

У нумары «Зьвязды» ад 21 лютага на другой старонцы ў зьмешчаным артыкуле «Прафсаюзы і работа сярод настаўніцтва» выпаў наступны радок «З дакладу т. Рычкова».

Гісторыя сучаснага Кітаю пішацца кроўю працоўных, рабочых і сялян

БЭРЛІН, 19. У буржуазнай газэце «Франкфуртэр Цэйтунг» апублікавана справаздача амэрыканкі Сьмідлэй аб кітайскай чырвонай арміі. Па словах Сьмідлэй у Кітаі ў сучасны момант маецца 25 добра арганізаваных чырвоных армій і, акрамя таго, некалькі больш дробных, рэвалюцыйных вайсковых часьцей, якія знаходзяцца зараз у стадыі фармаваньня. Усяго гэтыя арміі налічваюць 150.000 сялян і рабочых і некаторую колькасьць інтэлігентаў. Зброю гэтыя чырвоныя арміі забіраюць у пераможанага ворага, у заваёваных гарадох ці ў пераходзячых на іх бок вайсковых часьцей нанкінскага ўраду.

Сьмідлэй падкрэсьлівае, што акрамя 150.000 чырвоных салдат мільёны мужчын, жанчын і моладзі аб'яднаны ў рэвалюцыйныя арганізацыі моладзі, жаночыя арганізацыі, піянэрскія і ў сялянскі саюз самаабароны. Калі нанкінскія контррэвалюцыйныя войскі захапілі ў паўднёвай частцы правінцыі Цзянсі горад Тунгку (узмоцнены цэнтр савецкага руху), то аказалася, што там існаваў на працягу амаль чатырох год дасканала арганізаваны савецкі ўрад.

Сьмідлэй паказвае, што ў Кітаі не даюць паведамляць праўду. Так, нанкінскі ўрад да гэтай пары трымае ў сакроце, што праз месяц пасьля захопу Тунгку чырвоныя войскі адвазвалі яго назад і прасунуліся наперад у напрамку к Цзянсі. У пачатку студзеня чырвоная армія поўнасьцю зьнішчыла дзве нанкінскія дывізіі, захапіла 30.000 вінтовак, 20 кулямётаў, 4 палявых гарматы і тысячы палонных.

Сьмідлэй далей паведамляе, што для зьнішчэньня чырвоных армій нанкінскі ўрад карыстаецца ня толькі вінтоўкамі і кулямётамі, але і сродкамі подкупу. Чан Кай-шы назначыў за галаву выдатнейшых чырвоных камандзіраў на 12.000 даляраў (каля 24.000 рублёў). Ён абяцае кожнаму селяніну за выдачу радавога чырвонаармейца — 8 даляраў.

Гаворачы аб ролі чужаземных імпэрыялістаў у Кітаі, Сьмідлэй піша, што чужаземцы, якія знаходзяцца ў Кітаі, згуртавана падтрымліваюць нанкінскі ўрад і любога генэрала, які змагаецца супроць мас. У кітайскіх водах, галоўным чынам на Яндзы, знаходзіцца 121 чужаземнае вайсковае судно. За апошнія чатыры месяцы, пры дапамозе гэтых вайсковых суднаў было праведзена звыш 250 баёў супроць чырвонай арміі. Сваю справаздачу Сьмідлэй канчае словамі:

«Гісторыя сучаснага Кітаю — пішацца кроўю працоўных, рабочых і сялян, яна пішацца вельмі ясна, непрыкрашана, жостка і жудасна. Вайна Нанкіна супроць чырвонай арміі і чырвонага сялянства зьяўляецца вайной супроць працоўных мас, жорсткая эксплёатацыя нагорых пануючай клясай Кітаю і чужаземцамі ня мае сабе роўнай у гісторыі чалавецтва».

Заканчэньне сьледзтва па справе контр-рэвалюцыянэраў-меншавікоў

МАСКВА. Справа аб контр-рэвалюцыйнай арганізацыі Саюзнага бюро ЦК РСДРП (меншавікоў) Громана, Суханава, Шора і інш. скончана і на дніх будзе перадана на разгляд Вярхоўнага Суда СССР.

Арганізаваць сталінскі прызыў у калгасы—

ЗАПРАПАНАВАЎ КАЛГАС „АВАНГАРД“

у сувязі з набліжэньнем гадавіны апублікаваньня гістарычных артыкулаў тав. Сталіна

СМАЛЯВІЧЫ. (Па тэлефону).

Заслухаўшы даклад аб выніках студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, члены калгасу «Авангард» поўнасьцю ўхваляюць пастановы пленуму і далучаюцца да іх.

Сход адзначае, што посьпехі, дасягнутыя ў справе будаўніцтва сацыялізму, сталі магчымы толькі дзякуючы няўхільнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі, на аснове рашучага наступленьня на кулацтва і ліквідацыі яго як клясы.

Для практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў пленуму **агульны сход, у сувязі з набліжэньнем гадавіны апублікаваньня гістарычных артыкулаў правадыра камуністычнай партыі тав. Сталіна** («Головокружение от успехов» і «Адказ таварышом калгасьнікам»), **якія** (лісты) **паслужылі на ўзмацненьне калектывізацыі бядняцка - серадняцкіх мас на аснове правільнай ленінскай лініі, пастанаўляе:**

— Абвясьціць сталінскі прызыў у калгас.

Агульны сход заклікае ўсе калгасы і аднаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі раёну далучыцца да пастановы аб правядзеньні сталінскага прызыву.

Для практычнага правядзеньня сталінскага прызыву ў калгас лічым неабходным ажыцьцявіць наступнае:

Правесьці спэцыяльныя сходы калгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў, на якіх паставіць пастановы XVI партсьезду і пленуму ЦК КП(б)Б аб калектывізацыі;

Вылучыць па агульных сходах калгасаў спэцыяльныя брыгады і вярбовачныя групы з лепшых ударнікаў-калгасьнікаў для правядзеньня агіт.-масавай работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас аб задачах і значэньні сталінскага прызыву;

Прымацаваць партыйныя сілы, калгасныя брыгады, вярбовачныя групы і культурных работнікаў (настаўніцтва) да пэўных населеных пунктаў для правядзеньня сыстэматычнай масавай работы і сталінскага прызыву;

Правесьці сходы жанчын у калгасах супольна з жанчынамі батрачкамі, бяднячкамі і сераднячкамі—аднаасобнікамі па пытаньнях правядзеньня сталінскага прызыву;

Усю работу па арганізацыі сталінскага прызыву ўвязаць з прапрацоўкай дырэктыў партыі і ўраду аб кантрактацыі і дырэктывамі аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Члены калгасу «Авангард».

На заклік арцелі „Авангард“ АДНААСОБНІКІ з в. ТУРЫ аб'ядналіся ў калгас

СМАЛЯВІЧЫ. (Па тэлефону).

Першай на заклік калгасу «Авангард» адгукнулася в. Туры, Верхменскага сельсавету. **10 аднаасобнікаў**—беднякоў і сераднякоў гэтай вёскі **аб'ядналіся ў калгас.** Пасьля ўстаноўчага сходу яны зьвярнуліся да калгасу «Авангард» і ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў - беднякоў і сераднякоў БССР з наступным лістом:

— Мы цалкам ухваляем ідэю калгасу «Авангард» аб арганізацыі сталінскага прызыву ў калгасы, у сувязі з набліжэньнем гадавіны апублікаваньня артыкулаў т. Сталіна па пытаньнях калектывізацыі. **Лепшым адказам на заклік калгасу «Авангард» зьяўляецца нашае неадкладнае аб'яднаньне ў калгас.**

— Мы, учарайшыя аднаасобнікі, адзначаем, што гістарычныя артыкулы т. Сталіна і дырэктывы партыі забясьпечылі далейшы рост і ўмацаваньне калгаснага руху на аснове ленінскіх наказаў, сваячасова ўдарыўшы па «лявацкіх перагібах у справе калектывізацыі, якія гралі на руку кулаку.

— Мы ведаем шмат калгасаў, якія ў жорсткай барацьбе з кулаком бліскуча здалі бальшавіцкі экзамэн. Пад кіраўніцтвам партыі і рабочай клясы яны дабіліся значных посьпехаў у замацаваньні сваёй гаспадаркі і далейшым росьце. Кулаку ня ўдасца затрымаць калгасны рух. Масы беднякоў і сераднякоў ужо сталі на адзіна правільны шлях перабудовы сельскай гаспадаркі—гэта шлях калектывізацыі.

— Практыка калгасаў ярка даказала тыя вялізарныя перавагі, якія мае калгасная гаспадарка перад аднаасобнай. Прыкладам служыць наш суседні інтэрнацыянальны калгас «Новае жыцьцё», дзе за адзін працоўны дзень выходзіць 2 р. 25 к.

— Мы заклікаем усіх беднякоў і сераднякоў - аднаасобнікаў пасьледваць нашаму прыкладу, пайсьці па шляху калектывізацыі, па якім вядзе нас партыя на чале з т. Сталіным.

— Мы лічым, што магутны калгасны сталінскі прызыў у калгасы зьявіца лепшым адказам аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў на паход імпэрыялістаў супроць савецкай пяцігодкі і антысавецкія вымыслы аб «прымусовай» працы ў СССР.

— Пачынаючы рыхтавацца да веснавой сяўбы ў нашым новым калгасе, мы абавязуемся правесьці яе сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі і ўцягнуць у калектыў астатнюю частку нашай вёскі.

Клюйко С. С., Шчурок С., Пяршай А. М., Пяршай Р. К., Казлоўскі Л. А., Пяршай А. К., Пяршай С. Л., Пархімовіч А., Пяршай К. П.

РАЙКОМАМ КП(б)Б, РКК і РАЁННЫМ ГАЗЭТАМ

У сувязі з усесаюзнай праверкай дырэктыў падрыхтоўкі да сяўбы, якая адбудзецца з 1 па 4 сакавіка, дэкада праверкі, абвешчанай ЦК КП(б)Б, аб'ядняецца з усесаюзнай праверкай.

Дэкада праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы, спадабаючы адно са зьвеньняў барацьбы за сяўбу на аснове далейшага разгортваньня калектывізацыі, павінна стварыць рэзкі пералом ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце па лініі ўсіх мерапрыемстваў. Праверка павінна выявіць найбольш слабыя вучасткі, выкрыць прычыны адставаньня і прарываў, паказаць узоры прыкладнай работы паасобных раёнаў, калгасаў, саўгасаў, вёсак, аказаць дапамогу ў ліквідацыі недахопаў, мабілізаваць масы на ліквідацыю прарываў, на яшчэ больш хуткае ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Асабліва ўвага павінна быць зьвернута на дакез ударнай падрыхтоўкі да сяўбы, на якім іншыя раёны, калгасы і вёскі маглі-б вучыцца.

Вялізарная роля ў праверцы вызначана друку. Друк пад кіраўніцтвам партыі на аснове генэральнай лініі павінен дапамагчы партыйным, савецкім і іншым арганізацыям «стаць на чале новага ўздыму калгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць тым самым рашаючыя посьпехі ў справе ліквідацыі кулацтва і сацыялістычнай перабудовы вёскі».

Друк абавязан мабілізаваць, арганізаваць новыя і новыя масы працоўных на барацьбу за сяўбу. У сувязі з гэтым вялізарную работу трэба разгарнуць сярод рабселькораў. Трэба мабілізаваць рабселькораў ня толькі як сыгнапізатараў аб тых ці іншых недахопах, але і як непасрэдных арганізатараў мас, барацьбітоў за выкананьне і перавыкананьне плянаў веснавой сяўбы. Неабходна ўцягнуць у праверку пагалоўна ўсіх селькораў вёсак і калгасаў, мабілізаваць іх на арганізацыю новага прыцёку ў калгасы, у прыватнасьці праз стварэньне ініцыятыўных груп з селькораў і чытачоў газэт.

Самы шырокі ўдзел павінны прыняць рабкоры. Многія заводы маюць непасрэдныя адносіны да абслугоўваньня веснавой сяўбы. Тое самае трэба сказаць і аб транспарце, які абавязак забясьпечыць сваячасовае прасоўваньне пасеўных грузаў і г. д.

Праверку трэба арганізаваць так, каб была забясьпечана арганізуючая і кіруючая роля нізавых партыйных ячэек і сельсаветаў з прыцягненьнем самых шырокіх мас мясцовай грамадзкасьці, груп беднаты, калгасьнікаў і актывістаў аднаасобнікаў.

Для ажыцьцяўленьня праверкі прапануецца пры райкоме стварыць раённы штаб з удзелам прадстаўнікоў грамадзкасьці, які кіруе ўсёй работай па праверцы. Штаб штодзенна павінен паведамляць «Зьвязьдзе» (па тэлеграфу, тэлефону, сьпешнай поштай) аб ходзе праверкі.

24 лютага прапануецца паведаміць «Зьвязьдзе» аб праводзенай падрыхтоўчай рабоце і ўжытых арганізацыйных мерапрыемствах.

Сакратар ЦК КП(б)Б— ШАРАНГОВІЧ.
Заг. Культпропам ЦК ЧАРНУШЭВІЧ.
Адказны рэдактар «ЗЬВЯЗДЫ» БУДЗІНСКІ.

Першыя тры калгасы сталінскага прызыву

СМАЛЯВІЧЫ. (Па тэлефону).

У сталінскі прызыў уключыліся в. в. Чарніцы, і Шаметава, Баратоўскага сельсавету. У першай арганізаваўся калгас у складзе 14 гаспадарак, у другой—з 11 гаспадарак. Арганізаваўся калгас у в. Туры.

Весткі аб тым, што сталінскі прызыў у калгасах ужо разгортваецца, паступаюць з усіх канцоў раёну. Ідэя калгасу «Авангард» падхоплена ўсімі калгасамі, якія разгарнулі работу па арганізацыі сталінскага прызыву. Усюды адзначаецца прыліў.

У Смалявічах адбылася спэцыяльная парада партыйнага, камсамольскага і беспартыйнага раённага актыву, якая вылучыла 75 брыгадзіраў. Брыгадзіры выехалі ў вёскі.

МІЖРАЕННАЯ БРЫГАДА— У ДАПАМОГУ АДСТАЛЫМ С-С.

Смалявіцкі райком партыі пастанавіў абвясьціць па раёне сталінскі калгасны прыліў

СМАЛЯВІЧЫ. (Па тэлефону).

БЮРО СМАЛЯВІЦКАГА РАЙКОМУ КП(б)Б, абмеркаваўшы пастанову агульнага сходу членаў калгасу «АВАНГАРД» і зварот новых калгасьнікаў з вёскі Туры, ПАСТАНАВІЛА АБВЯСЬЦІЦЬ ПА РАЁНЕ, У СУВЯЗІ З НАБЛІЖЭНЬНЕМ ГАДАВІНЫ АПУБЛІКАВАНЬНЯ АРТЫКУЛУ ТАВ. СТАЛІНА, СТАЛІНСКІ ПРЫЗЫЎ У КАЛГАСЫ.

Правядзеньне сталінскага прызыву увязаць з праверкай пастаноўкі масавай і сыстэматычнай работы з батрацтвам і беднатой і выкананьнем пастановаў апошніх пленумаў ЦК і ЦКК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, а таксама прапрацоўкай адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі.

УСЯ ПАРТЫЙНАЯ І КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫІ АБВЯШЧАЮЦЦА МАБІЛІЗАВАНЫМІ НА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ У КАЛГАСЫ.

Для правядзеньня практычнай работы па разгортваньні прызыву бюро райкому пастанавіла:

АРГАНІЗАВАЦЬ МІЖРАЕННУЮ БРЫГАДУ з лепшых калгасьнікаў раёну і накіраваць яе ў сельсаветы, якія адстаюць у справе арганізацыі калгаснага прыліву.

У раёнах дасяжнасьці калгасаў АРГАНІЗАВАЦЬ З КАЛГАСЬНІКАЎ ВЯРБОВАЧНЫЯ БРЫГАДЫ, ПРЫМАЦАВАЎШЫ ІХ ДА СУСЕДЗЯЎ-АДНААСОБНІКАЎ;

Правесьці па ўсіх калгасах раёну ТАВАРЫСКІЯ ВЕЧАРЫ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ, на якіх абгаварыць задачы і значэньне сталінскага прызыву, а таксама пытаньні, зьвязаныя з пасьпяховым правядзеньнем другой бальшавіцкай сяўбы;

АРГАНІЗАВАЦЬ ПА КАЛГАСАХ АТРАДЫ ЖАНЧЫН-АГІТАТАРАЎ ЗА КАЛГАСЫ.

Камандыраваць у сельсаветы ўпаўнаважаных райкому партыі, брыгады камсамольскага актыву і прафсаюзаў.

Арганізуем калгас імя X зьезду саветаў

У падарунак X бальшавіцкаму зьезду саветаў беднякі і серадняк вёскі Запольле, Пятрыкоўскага ранёву, у колькасьці 32 гаспадарак аб'ядняюць у калгас імя X зьезду саветаў. Калгасьнікі даюць абяцаньне, што ўсе пастановы, прынятыя зьездам, з гонарам будуць праведзены ў жыцьцё.

Бура пралетарскага гневу і абурэньня

РАБОЧЫЯ УСЯГО СССР ДОБРА ВЕДАЮЦЬ, ШТО НАГЛАЙ ХЛУСЬНЁЙ КАПІТАЛІСТЫ ПРЫКРЫВАЮЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА УЗБРОЕНАГА НАПАДУ НА АДЗІНУЮ ПРАЛЕТАРСКУЮ ДЗЯРЖАВУ

БАРЫСАЎСКІЯ ЛЕСАРУБЫ - УДАРНІКІ АДКАЗВАЮЦЬ

НА ПАКЛЁПЫ СУСЬВЕТНЫХ КАПІТАЛІСТАЎ АБ „ПРЫМУСОВАЙ ПРАЦЫ“ У СССР—РАЗГОРТВАНЬНЕМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА І СТВАРЭНЬНЕМ УДАРНЫХ БРЫГАД

Рэзалюцыя - пратэст раённай канфэрэнцыі барысаўскіх лесарубаў-ударнікаў

БАРЫСАЎ. Заслухаўшы інфармацыю аб выступленьнях буржуазнага друку аб нібы «прымусовай працы» на лесазагатоўках у СССР, РАЁННАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ЎДАРНІКАЎ - ЛЕСАРУБАЎ БАРЫСАЎСКАГА ЛЕСПРАМГАСУ глыбока абурана наглай хлусьнёй міжнародных грабежнікаў - драпежнікаў і рашуча пратэстуе супроць новай правакацыйнай вылазкі цьвёрдалобых усіх масьцей супроць Савецкага Саюзу.

КАНФЭРЭНЦЫЯ З УСЁЙ АДКАЗНАСЬЦЮ ЗАЯЎЛЯЕ, ШТО Ў САВЕЦКІМ САЮЗЕ ПРЫМУСОВАЙ ПРАЦЫ НІКОЛІ НЯ БЫЛО І НЯ БУДЗЕ, ШТО ПРАЦА САВЕ

РЭКАНСТРУКЦЫЙНЫ ПЭРЫЯД І ЗАДАЧЫ САВЕТАЎ

Прамова сакратара ЦК КП(б)Б тав. К. В. ГЕЯ на адкрыцьці Х-га зьезду саветаў

Дзесятаму Ўсебеларускаму зьезду саветаў гарачае бальшавіцкае прывітаньне ад імя Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (лоўтгія воплескі).

Рашуча перабудаваць работу саветаў

Першым пытаньнем, на якім трэба спыніцца, вітаючы ваш зьезд ад імя ЦК КП(б)Б, зьяўляецца бязумоўна пытаньне аб рашучай перабудове работы саветаў у адпаведнасьці задачам рэканструкцыйнага пэрыяду. У чым заключаецца рэканструкцыйны пэрыяд, якія яго асноўныя характэрныя асаблівасьці?

Рэканструкцыйны пэрыяд—гэта перш за ўсё, разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце. Лёзунг аб выкананьні пяцігодкі за 4 гады, а ў радзе галін і за больш кароткі тэрмін зьяўляецца адным з важнейшых канкрэтных установак партыі ў справе разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва.

Рост сацыялістычнай індустрыі ў Савецкім Саюзе, які забясьпечыў посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, на аснове саўгаснага і калгаснага будаўніцтва, дазволіў нам паставіць перад сабой задачу — ліквідаваць кулацтва як клясу на базе суцэльнай калектывізацыі. Гэта гіганцкі крок наперад па шляху знішчэньня клясаў, на шляху непасрэднага сацыялістычнага будаўніцтва.

Рэканструкцыйны пэрыяд характарызуецца тым, што адбываецца рашучы зрух у суадносінах клясавых сіл у бок далейшага ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту. Узрастае рабочая кляса, замацоўваюцца яе пазыцыі. У вёсцы ствараецца моцная апора савецкай улады і партыі ў асобе калгасьніка, які перастае быць дробным уласьнікам і паступова становіцца актыўным удзельнікам сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі.

У рэканструкцыйны пэрыяд яшчэ больш умацоўваецца саюз рабочай клясы і асноўных мас сялянства на новай аснове — на аснове вытворчай змычкі гораду і вёскі.

Зараз саюз рабочай клясы і асноўных мас сялянства ажыцьцяўляецца намі не на той базе, на якой ён ажыцьцяўляўся ў пэрыяд рэсьвітру НЭП'у. Зараз, у апошнім этапе НЭП'у, калі, як гаварыў тав. Сталін на XVI зьезьдзе партыі, мы ўжо увайшлі ў пазаду сацыялізму, форма змычкі рабочай клясы і сялянства зьмяняецца, асновай узаемадносін пралетарскага гораду і вёскі зараз зьяўляецца вытворчая змычка.

У выніку гэтага зруху клясавых сіл і клясавых суадносін, у значнай ступені і ўмацаваньня і ўзмацняючага дыктатуру пралетарыяту ў нашай краіне, мы маем вялізарнейшы рост творчай актыўнасьці і энтузіязму рабочых мас. Сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва і іх разнастайныя формы (буксіры, «сквозные» брыгады і г. д.)—яркія факты творчага ўдыму як сярод пралетараў гораду, так і сярод саўгасных рабочых і калгаснікаў. Гэты нябывалы творчы палёт у справе барацьбы за далейшае пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва адлюстроўвае зьмену суадносін клясавых сіл.

З другога боку, у рэканструкцыйны пэрыяд мы маем узрослае супраціўленьне клясавых ворагаў. Клясы, якія аджываюць, ведаюць, бачаць, што мы ўступілі на шлях непасрэднага будаўніцтва сацыялізму, на шлях знішчэньня клясаў, і, адчуваючы сваю пагібель, яны яшчэ больш узмацняюць супраціўленьне ўсім мерапрыемствам дыктатуры пралетарыяту, савецкай улады і камуністычнай партыі.

Прыхваснi аджываючых клясаў—буржуазная інтэлігенцыя, тая праслойка інтэлігенцыі, якая зьвязала свой лёс з лёсам буржуазіі і кулацтва, таксама ўзмацняе сваю шкодніцкую падрыўную работу, супраціўленьне ажыцьцяўленьню нашай палітыкі. У выніку гэтага мы маем малюнак абвастрэньня клясавай барацьбы. Адгэтуль кулацкі тэрор у вёсцы, шкодніцтва, якое выкрыта на радзе важнейшых гаспадарчых вучасткаў, адгэтуль рост шавінізмаў усялякіх адценьняў. Адгэтуль, нарэшце, узьнікаюць і жывяцца ў пасобных найменш устойлівых зьвеньнях партыі правыя і «левыя» ўхілы ад генэральнай лініі партыі.

Рэканструкцыйны пэрыяд адначасова ажыцьцяўляецца ва ўмовах надыходзячага другога цыклю войнаў, у якіх наша пралетарская дзяржава павінна будзе абараняць сваё права на існаваньне першай у сьвеце краіны Саветаў. Яшчэ Ўладзімер Ільліч у пэрыяд завяршэньня грамадзянскай вайны, з якое Савецкі Саюз выйшаў пераможцам, пісаў, што нам прадстаіць перажыць другі цыкль войнаў з капіталістычным сьветам. Ленін тады пісаў, што сумесное існаваньне краін імпэрыялістычных і краіны дыктатуры пралетарыяту павінна будзе знайсьці сваё выражэньне ў непасрэднай сутычцы гэтых дзьвюх сыстэм. З кожным годам усё больш і больш набліжаецца тэрмін, калі нашы клясавыя ворагі направяць ажыцьцявіць узброены напад на Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, да якога імпэрыялісты так ліхаманкава рыхтуюцца. Падрыхтоўка да вайны ва ўсіх капіталістычных краінах праходзіць з ліхаманкавай хуткасьцю. Нават зараз, у эпоху сусьветнага эканамічнага крызісу, калі напалову бязьдзейнічаюць прамысловыя прадпрыемствы, нават і зараз усе ваенныя прамысловасьці капіталістычных краін працуе з поўнай нагрузкай, бязупынна павялічваючы сваю прадукцыйнасьць.

Адгэтуль з усёй выразнасьцю ставіцца задача—будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне трэба цесна, арганічна ўвязаць з неаслабным клопатам аб узмацненьні абароназдольнасьці нашай краіны, ні на адну мінуту не забываць пра гэту задачу.

Нашы труднасьці—труднасьці росту

Ці ёсьць труднасьці ў рэканструкцыйны пэрыяд? Так, ёсьць. Гэтыя труднасьці, іх характар наша партыя выясьніла ня раз. Ленінім, найбольш вязным і глыбокім аналізам нашых труднасьцяй зьяўляецца той аналіз, які дан тав. СТАЛІНЫМ у яго дакладзе на XVI зьезьдзе ВсесКП(б).

«Перш за ўсё—гаварыў т. Сталін—нашы труднасьці зьяўляюцца ня трудасьцямі дробных і выпадковых недахопаў, а труднасьцямі клясавай барацьбы. Па-другое, за нашымі труднасьцямі хаваюцца нашы клясавыя ворагі. Гэтыя труднасьці ўскладняюцца расначлівым супраціўленьнем аджываючых клясаў у нашай краіне, падтрымальнем гэтых клясаў звонку, налучаньнем буржуазных элемэнтаў у нашых уласных установах, налучаньнем шкоднічэньнасьці і коснасьці ў некаторых праслойках нашай партыі. На-трэцяе, для перамогі труднасьцяй неабходна перш за ўсё адбіць атаку капіталістычных элемэнтаў, зламаць супраціўленьне і расчысьціць такім чынам дарогу для шпаркага прасоўваньня наперад.

Нарэшце, самы характар нашых труднасьцяй, якія зьяўляюцца труднасьцямі росту, дае нам магчымасьці, неабходныя для падаўленьня клясавых ворагаў».

Такіх чынам пытаньне аб нашых труднасьцях ёсьць пытаньне клясавай барацьбы, і тым, хто ўмее змагацца з клясавым ворагам, хто ўмее перамагаць яго супраціўленьне, — тым будуць выходзіць пераможцамі з нашых труднасьцяй росту, а тыя, хто правяць ня-ўпоўнепасьць, хістаньні, праваапартуністычнае ныўменьне змагацца з клясавым ворагам, праваапартуністычную сьлепоту перад клясавым ворагам, — тыя ня здолеюць перамагчы гэтых труднасьцяй і памінуча ўгадуць у пешку перад гэтымі труднасьцямі.

Вазьмеце ўвесь вопыт нашай савецкай работы за апошні час.

Аб чым нам гаворыць гэты вопыт? Гэты вопыт гаворыць аб тым, што там, дзе палітыка ў адносінах да кулацкай верхаўкі вёскі была праведзена правільна, праведзена пасьлядоўна і да канца, там мы маем пасьпяховы ход загатовак, пасьпяховае выкананьне асноўных гаспадарча палітычных задач у вёсцы.

Вазьмеце ход нашай работы ў галіне прамысловага будаўніцтва. Там, дзе мы здолелі перакрыць, выкрыць, выявіць шкодніцтва, там, дзе мы здолелі перамагчы імкненьні шкодніцкіх элемэнтаў затармазіць, сарваць, разбурыць нашу работу, там мы выходзім пераможцамі і пасьпяхова ажыцьцяўляем нашы задачы па будаўніцтве сацыялістычнай прамысловасьці. Там-жа, дзе ў пазобных зьвеньнях савецкага і гаспадарчага апарату, у пасобных праслойках нашай партыі пануюць праваапартуністычныя ўстаноўкі, праваапартуністычныя адносіны да справы, праваапартуністычная стаўка на «самацёк»,—там клясавы вораг застаецца яшчэ неразьбітым і ў выніку яго дзейнасьці пасобныя савецкія органы не перамагаюць труднасьцяй, а падаюць духам, здаюць пазыцыі ў барацьбе з гэтымі труднасьцямі. Такі агульны асноўны урок, асноўны вынік усіх тых буйнейшых гаспадарча-палітычных заданьняў, якія мы праводзілі ў апошні час.

Без праверкі выкананьня ня можа быць бальшавіцкай барацьбы з бюракратызмам

Адной з буйнейшых перашкод у справе барацьбы з клясавым ворагам зьяўляецца бюракратызм у пасобных зьвеньнях савецкага апарату.

«Неблаговесная бюракратызму—гаварыў т. Сталін—заключаецца перш за ўсё ў тым, што ён трымае над сабой вялізарныя рэзервы, якія ёсьць у нетрах нашага ладу, не даючы іх выкарыстаць, стараецца зьвесьці на нішто творчую ініцыятыву мас, скоўвае ня канцылярычнай і ня радзе справу да таго, каб кожнае новае начынаньне партыі ператварылася ў дробнае, нікчэмнае крохаборства. Неблаговесная бюракратызму, па-другое, заключаецца ў тым, што ён на шчэпіць праверкі выкананьня і імкнецца ператварыць асноўныя указаньні [illegible] ў пустую паперку, адарваную ад жыцьця. Неблаговесную бюракратызм ня толькі і ня столькі старыя бюракраты, але і ў асобнасьці новыя бюракраты, бюракраты савецкія, сярод якіх камуністы-бюракраты грацюць далека не апошнюю ролю. Я маю на ўвазе тых «камуністаў», якія канцылярскімі распарадженьнямі і дакрэтамі, у сілу якіх яны верыць, як у фэтыш, стараецца надаваць творчую ініцыятыву і самадзейнасьць мільённых мас рабочых і сялянства».

І вось гэтага ўнутранога ворага—бюракратызм, коснасьць у рабоце савецкага апарату—нам трэба абязьвекова і рашуча перамагчы для таго, каб з посьпехам выканаць задачы, пастаўленыя перад намі ў рэканструкцыйны пэрыяд, для таго, каб поўнасьцю справіцца з клясавым ворагам.

Тэзу і партыі, і саветы высоўваюць зараз на адно з першых важнейшых месц задачу настойлівай і сыстэматычнай праверкі выкананьня. Без праверкі выкананьня ня можа быць бальшавіцкай барацьбы з бюракратызмам, бо бюракрат тым іменна і адрозьніваецца ад дзелавога савецкага работніка, што ён глядзіць на рэзалюцыю, глядзіць на паперу і забывае пра выкананьне, пра жывую справу, пра выкананьне тых указаньняў, якія ў гэтай рэзалюцыі ёсьць, якія на гэтай паперы запісаны.

Таварышы! Калі мы зьбіраемся на нашы зьезды саветаў і падагульваем вынікі нашага будаўніцтва, мы ў першую чаргу гаворым аб тых вялізарнейшых дасьпеньнях, якія мы маем у любой галіне сацыялістычнага будаўніцтва. І адначасова на нашых зьездах мы з усёй жорсткасьцю крытыкуем недахопы нашай работы. На першы погляд атрымліваецца як быццам-бы супярэчнасьць: з аднаго боку — вялізарнейшыя дасьпеньні, аб якіх кожны з нас можа з гонарам заявіць зьезду і ў асобе зьезду ўсім рабочым, калгаснім і батрацка-бядняцка-серадняцкім масам, з другога боку—жорсткая крытыка недахопаў у нашай работе. Але гэта супярэчнасьць—толькі здаецца. У гэтым іменна месцы забываліся многія з праваапартуністычнага лагеру, у гэтым іменна месцы забываюцца права-«яваецы» беспрынцыпны баёк Сырцова-Ламінадзе,—адзін праз на-вялічальнае пяро бачыць недахопы нашай работы, але забываці аб тым, што вялізарная гістарычная справа правядзіцца з посьпехам, ажыцьцяўляецца шпаркімі тэмпамі. Яны забылі аб тым, што нашы труднасьці зьяўляюцца труднасьцямі росту, якія самі ў сабе маюць сілы для іх перамогі.

Мы можам сказаць, таварышы, што мы робім пячуваную ў гісторыі справу сусьветнага значэньня, мы можам сказаць, што мы дасягнулі і ажыцьцявілі тое, чаго да нас ніхто нідзе яшчэ не дасягаў і не ажыцьцяўляў, — мы будуем сацыялізм, будуем яго рукамі мільённых мас рабочай клясы і сялянства. Лічбы разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці, індустрыі ў нашым Савецкім Саюзе, лічбы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і шпаркага росту і ўздыму прадукцыйных сіл сельскай гаспадаркі гавораць нам аб гэтым.

Справімся з задачай, пастаўленай т. Сталіным, аўладаем тэхнікай

Аднак, нам не хапае культурнасьці, не хапае ведаў, не хапае ведаў тэхнічных у першую чаргу. Тав. Сталін на Ўсесаюзнай канфэрэнцыі работнікаў прамысловасьці гаварыў:

«Вядома, у аснове шкодніцтва ляжыць клясавая барацьба, вядома, клясавы вораг шалёна супраціўляецца сацыялістычнаму наступленьню, але аднаго гэтага для тлумачэньня такога пышнага росквіту шкодніцтва мала.

Як магло здарыцца, што—шкодніцтва набыло такія шырокія разьмеры, хто ў гэтым вінават? Мы ў гэтым вінаваты. Калі-б мы справу кіраўніцтва гаспадаркай пастаўлілі інакш, калі-б мы значна раней перайшлі да вывучэньня тэхнікі справы, калі-б мы перайшлі да аўладаньня тэхнікай і калі-б мы часьцей і талкова ўмешваліся ў кіраўніцтва гаспадаркай, шкодніцкам не ўдалося-б так многа нашкодзіць. Трэба самім стаць спэцыялістамі, гаспадарамі справы, трэба павярнуцца тварам да тэхнікі, тварам да тэхнічных ведаў — вось куды штурхае нас жыцьцё».

І далей:

«Час адкінуць стары лёзунг, аджыўшы лёзунг аб неўмяшаньні ў тэхніку і стаць самім спэцыялістамі, знаўцамі справы, стаць самім поўнымі гаспадарамі справы».

Нашы труднасьці — у асноўным труднасьці клясавай барацьбы, труднасьці супраціўленьня кулацтва і шкодніцкіх элемэнтаў. Наша ўменьне перамагаць гэтыя труднасьці ў першую чаргу залежыць ад правільнай палітычнай устаноўкі, а правільная палітычная ўстаноўка ў нас ёсьць. Правы апартунізм мы з посьпехам выкарчоўваем са сваіх радоў, «левым» хістаньням мы з посьпехам даем адпор. У другую чаргу ўменьне перамагаць супраціўленьне клясавага ворага залежыць і ад агульнага ўзроўню нашай культурнасьці, ад веданьня тэхнікі справы. У гэтай частцы нам трэба яшчэ праробіць вялікую работу.

Падрыхтоўка кадраў — вось тое вузкае месца, аб якім мы ўсе зараз гаворым, падрыхтоўка кадраў новых, чырвоных спэцыялістаў з рабочых і сялян, кадраў спэцыялістаў, якія-б ведалі тэхніку сваёй справы і якія-б маглі кіраваць заводамі і фабрыкамі, саўгасамі, трактарнымі станцыямі і г. д.

Ці справімся мы з тай задачай, якая пастаўлена перад намі ў прамове тав. СТАЛІНА? Ці зможам мы аўладаць тэхнікай, ці зможам мы падрыхтаваць кадры соцень тысяч і мільёнаў новых будаўнікоў сацыялізму з ліку рабочых і сялян? Так, таварышы, зможам.

Мы брацёся і ажыцьцяўлялі задачы розных труднасьцяй і мы вырашылі іх з посьпехам. Мы вырашым з посьпехам і тую задачу, якая зараз перад намі пастаўлена.

У чым павінна заключацца перабудова саветаў на даным этапе?

Са сказанага, таварышы, можна зрабіць некаторыя вывады аб тым, у чым павінна заключацца перабудова саветаў на даным этапе ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду.

Гэта перабудова заключаецца ў першую чаргу ў тым, каб узмацніць ролю саветаў у ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі. Ня можа быць у рэканструкцыйны пэрыяд такога сельсавету, такога РВК, які-б зараз, у момант напружанай работы, абмяжоўваў свае функцыі адміністрацыйна-тэхнічнымі. Ня можа быць такога становішча, калі партыйныя, камсамольскія і прафэсыянальныя арганізацыі працуюць, скажам, у вёсцы па выкананьні таго ці іншага заданьня, праводзяць жывую грамадзкую работу, высады, расшчэпленьне, цолы рад мерапрыемстваў, а ў гэты час сельсавет або РВК заставаліся-б у баку ад гэтай справы, прадстаўлялі-б з сябе толькі канцылярскую адміністрацыйна-тэхнічную адзінку, якая піша і выдае загады і, так сказаць, рэгіструє работу гэтых грамадзкіх, партыйных арганізацый. Ня можа быць такога становішча зараз! Савет павінен, закасаўшы рукавы, не па-паперовому, а энэргічна, настойліва, актыўна працаваць над ажыцьцяўленьнем тых задач, якія стаюць перад органамі савецкай улады. Гэта задача — узмацніць ролю саветаў у ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі — цэнтральным чынам, вядома, зьвязана з аднаўленьнем саветаў ад праваапартуністычных элемэнтаў, ад «левых» зьбіўшчыкаў. На можа быць кіраўніком саветаў правы апартуніст або прымірэнец, якія не ажыцьцяўляюць генэральнай лініі, якія актыўна не праводзяць барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва.

Другой задачай, якая забясьпечвае паварот саветаў тварам да новых задач рэканструкцыйнага пэрыяду, зьяўляецца неабходнасьць абаперціся зараз на новы, масавы актыў. Гэты новы актыў скалеўся на фабрыках і заводах у асобе ўдарнікаў, актыўных барацьбітоў за выкананьне прамфінплану, гэты новы актыў скалеўся ў вёсках і сёлах у асобе калгаснікаў — байцоў за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі. Гэты новы актыў — стаў рашаючай сілай ва ўзьнікненьні сацыялістычнай вёскі ў сельскай гаспадарцы.

Трэцяе, у чым заключаецца перабудова саветаў — гэта пасьлядоўная, настойлівая і рашучая барацьба з бюракратызмам, далучэньне самае — рашучая і шырокае разгорнутае ўнутрыпартыйнае дэмакратыі і зьвяжэнне ранняе пралетарскай самакрытыкі, якая зьяўляецца мацнейшай зброяй у барацьбе за далейшае перамогі сацыялістычнага будаўніцтва.

У нас, у БССР, неабходнасьць разгорнутага самакрытыка і самакрытыка да гэтага часу застаецца адным з вузкіх месц у нашай работе.

Ці можа быць разам з тым самакрытыка скарыстана клясавым ворагам для барацьбы супроць мерапрыемстваў партыі і савецкай улады.

Так, можа.

Клясавы вораг можа скарыстаць і на пасобных вучастках ён скарыстоўвае самакрытыку для таго, каб змагацца супроць сацыялістычнага будаўніцтва, супроць мерапрыемстваў партыі, супроць мерапрыемстваў савецкай улады.

У такіх канкрэтных выпадках спробам клясавага ворага скарыстаць самакрытыку мы, вядома, павінны даваць рашучы адпор. Аднак, асноўным вузкім месцам, што перашкаджае разьвіцьцю самакрытыкі, зьяўляюцца факты заціску самакрытыкі.

Савецкім арганізацыям трэба моцна ўзяць у свае рукі зброю пралетарскай самакрытыкі, узяць яе ў рукі пралетарскай савецкай грамадзкасьці і скарыстаць яе поўнасьцю для барацьбы з недахопамі нашай работы і ў першую чаргу для зьнішчэньня і выкарчоўваньня розных форм і праяўленьняў бюракратызму.

Чацьвертае, шырокае ўцягненьне беспартыйных у савецкую работу — гэта таксама адна з чарговых задач, без выкананьня якое немагчымы паварот саветаў тварам да задач рэканструкцыйнага пэрыяду.

Тав. ЛЕНІН пакінуў нам адно са сваіх указаньняў, адно з важнейшых указаньняў у такой фармулёўцы:

«Мы кацка, — пісаў Ўладзімер Ільліч, — прадзім лёзунг — высоўвайце беспартыйных, правярайце беспартыйных работу партыйных».

Таварышы! Задачы рэканструкцыйнага пэрыяду, задачы набудовы сацыялізму можуць быць ажыцьцяўлены без удзельнасьці мільённых мас у вялізарнейшую работу па сацыялістычным будаўніцтве, мільённых мас рабочых, калгаснікаў, батраноў і бядняка-сераднякага складнота, а мільёны мас салян удзельнічаюць і становяцца ажыцьцяўнікамі сацыялістычнага будаўніцтва. Таму ўцягненьне беспартыйных актывістаў — рабочых і сялян, вельмі важнае, і ў першую чаргу ў работу нашых саветаў, зьяўляецца неабходнай умовай для таго, каб саветы змаглі ажыцьцявіць усе задачы, якія ўсталяваў на іх рэканструкцыйны пэрыяд.

Вядома, усе гэтыя задачы можуць быць выкананы толькі пры ўмове далейшага паскарэньня работы па узмацненьні росту, якія павінна стаць асноўным зьместам сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы, і па ўзмацненьні сельсаветаў, якія яшчэ далёка ў неналежнай ступені перабудаваліся для выкананьня сваіх адказных функцый.

Вось такі паварот у перабудове работы саветаў і пад гэтым пунктам погляду — прыстасоўна да новых задач рэканструкцыйнага пэрыяду — забясьпечыць нам новыя формы ўдзелу рабочых мас у дзяржаўнай рабоце, у рабоце савецкага апарату.

Рэканструкцыйны пэрыяд зьязан з нарэшце перабудовай работы саветаў, і ў сучасны момант мы можам ісьці значна далей, значна сьмялей па шляху прыцягненьня рабочых, якія працуюць на фабрыках, прадпрыемствах і на заводах, у штодзенны удзел у дзяржаўным жыцьці. Тут яшчэ зроблена далёка ня ўсё, і новы вопыт, канкрэтны вопыт работы будзе каштоўным укладам у ажыцьцяўленьне гэтай задачы партыі.

Усялякае праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму накіравана да зрыву сацыялістычнага будаўніцтва.

Усялякае праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму накіравана да зрыву сацыялістычнага будаўніцтва

Вітаючы вас ад імя ЦК КП(б)Б, лічу неабходным асобна спыніцца на адным з важнейшых пытаньняў — на нацыянальным пытаньні.

Перш за ўсё дазвольце спыніцца на тым асноўным тэзісе, які выкінут партыяй, на тэзісе аб тым, што галоўнай небясьпекай на даным этапе зьяўляецца вялікадзяржаўны шавінізм.

ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНЫ ШАВІНІЗМ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ІМКНЕНЬНІ АДЖЫВАЮЧЫХ КЛЯСАЎ ВЯЛІКАРУСКАЙ НАЦЫІ, ЯКІЯ РАНЕЙ ПАНАВАЛІ, ВЯРНУЦЬ САБЕ СТРАЧАНЫЯ ПРАВЫ І ПРЫВІЛЕІ.

Узаканеньне ў якой-бы там ні было ступені імкненьняў і тэндэнцый вялікадзяржаўнага шавінізму ў нашым асяродзьдзі азначала-б зрыў сацыялістычнага будаўніцтва ў нацыянальных рэспубліках і абласьцях, азначала-б зрыў ня толькі культурнага будаўніцтва, але гэта пазбавіла-б нас магчымасьці ажыцьцяўляць уздым раней прыгнечаных народаў на найбольш высокі культурны ўзровень.

Для таго, каб правільна ацаніць усю небясьпеку вялікадзяржаўнага шавінізму, трэба паставіць пытаньне ў большым гістарычным разрэзе.

З аднаго боку мы маем капіталістычны сьвет — сьвет імпэрыялістычных дзяржаў, у якіх кожная вялікая дзяржава ўціскае дзесяткі і сотні мільёнаў працоўных розных нацыянальнасьцяй, і кожная маленькая дзяржава ўціскае вялікую колькасьць яшчэ больш дробных народаў і нацыянальнасьцяй, і мы маем дыктатуру пралетарыяту — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік — з другога боку.

Як стаіць справа ў капіталістычным сьвеце, што там, у краінах капіталу, разумеецца пад вырашэньнем нацыянальнага пытаньня? Дазвольце прывесьці самыя сьціслыя факты, якія характарызуюць становішча ў дзяржавах, якія знаходзяцца ў самай непасрэднай блізкасьці ад БССР. У нас, на тэрыторыі БССР — каля 5 мільёнаў беларускага насельніцтва. У Заходняй Беларусі, якая знаходзіцца пад ярмом беларанскай Польшчы, налічваецца паводле польскай статыстыкі каля 3 мільёнаў беларускага насельніцтва. Але мы ў праве лічыць, што польская статыстыка значна перапаміншае колькасьць беларускага насельніцтва, алаклічае частку беларусаў. Мы сьмела можам лічыць, што ў Заходняй Беларусі пражывае каля 5 млн. беларускага насельніцтва.

Як-жа ідзе гаспадарчае разьвіцьцё на тэрыторыі Заходняй Беларусі?

Перш за ўсё кідаюцца ў вочы калёніяльныя формы эксплёатацыі ў Заходняй Беларусі.

У нас, у БССР, будуюцца новыя фабрыкі і заводы, расьце рабочая кляса, будуюцца буйныя прадпрыемствы. У Заходняй-жа Беларусі, які ёсьць там сыроц, прыродныя багацьці эксплёатуюцца па-драўніцку, па-калёніяльнаму, гэтыя багацьці вывозяцца ў другія краіны. Тыя галіны прамысловасьці, якія існавалі і працавалі раней, зараз закрываюцца і руйнуюцца.

Адносіны да сялянства ў Зах. Беларусі можна выразна бачыць хаця-б з таго факту, што польскі ўрад насадзіў і насаджае інстытут асадніцтва, інстытут дробных памешчыкаў, роля якіх вельмі яркая для кожнага з нас.

Сыстэма штрафаў у адносінах да сялянства, матар'яльны ўзровень якога значна ніжэйшы матар'яльнага ўзроўню сялянства БССР, зьяўляецца сваяасаблівай формай тэрору. Нават выбегны са двара селяніна сабака, калі ён ня мае нашыйніка, можа быць повадам да налажэньня штрафу. Разьмер гэтых штрафаў вельмі значны.

Вядома, штрафная палітыка не закранае кулацкай, заможнай часткі вёскі, капіталістычных элемэнтаў вёскі, а поўнасьцю служыць мэтам правядзеньня пэўнай палітыкі. Ужываюцца сродкі і значна горшыя, чым грашовыя штрафы. Жахлівае ўпаткага засьцёнку не зьяўляецца адзінкавымі выключэньнямі ў практыцы «форм і мэтадаў работы» польскага фашызму.

А вось некаторыя даныя, якія характарызуюць становішча культурнага будаўніцтва.

У нас, у БССР, школы абслугоўваюць беларускае насельніцтва на беларускай мове. У нас у сучасны момант 12 вышэйшых навучальных устаноў, у якіх выкладаньне ў большай сваёй часьці праводзіцца на беларускай мове.

На тэрыторыі ўсёй Заходняй Беларусі ўсяго толькі 3 беларускіх гімназіі (якія абслугоўваюць у першую чаргу кулацкіх сынкоў).

У нас за 8 м-яцаў 1930 г. выдана 26 млн. друкаваных аркушаў беларускай кнігі. На тэрыторыі Зах. Беларусі за пэўны год выходзіць усяго некалькі кніг на беларускай мове, прычым кніг яркаварожага зьместу ў адносінах да працоўных.

Гэта пераўкананьне ў належнай ступені паказвае, што мы ацэнуем тут і там зусім розныя разумеваньні.

У прыдушэньні фашыстскім ботам Зах. Беларусі нацыянальна-вызваленчы рух паладжаецца сыстэматычнаму разгрому. Культурна-асьветная работа праследуецца. Там было разгромлена таварыства беларускай школы — ТВШ.

Бежэруская Грэцкая, як вам вядома, была разгромлена і разьбіта ў 1927 годзе. Быў выкінуты працэс. У 1928 годзе стварылася грэка таварыства з былых ваяўнікаў Грэцкага пад назвай Беларускі рабочна-сялянскі клюб «Змоганьне» (а Грэцкім і Дзержынскім на зале). Плянфармай гэтага клюбу быў саюз рабочых і сялян пад кіраўніцтвам пралетарыяту, супроць фашыстскай дыктатуры.

Гэты клюб быў разгромлен паліцыяй, а пасьля былі ў мінулым годзе арыштаваны і іх пакаўна судзілі.

Такія кароткія мэтады вырашэньня нацыянальнага пытаньня, якія ўжываюцца за два дзесяткі кілёмэтраў ад таго месца, дзе сёньня сабраўся наш X-ты зьезд саветаў, такія тыя мэтады, якія яшчэ раз вусім ярка і пераканаўча паказваюць, што ўсе капіталістычныя, імпэрыялістычныя краіны пабудованы па пачатках грабежніцтва, эксплёатацыі, уціску і прыгнечаньня дробных народаў, дробных нацыянальнасьцяй і калёніяльных народаў, на пачатках эксплёатацыі працоўных.

З другога боку бацькаўшчына пралетараў усяго сьвету — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік — пабудаваны на пачатках брацкага супрацоўніцтва народаў, якія забясьпечваюць буйны рост гаспадарак нацыянальных рэспублік і пасьпяховае будаўніцтва культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместе.

У такіх умовах усялякае праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму, калі-б яно не знайшло належнага і дружнага адпору з нашага боку, ня толькі зрывала-б сацыялістычнае і нацыянальна-культурнае будаўніцтва ў нас, але і вяло-б да аслабленьня давер'я прыгнечаных нацыянальнасьцяй і калёніяльных народаў да пралетарыяту Савецкага Саюзу, які перамог у Кастрычніку і зараз ажыцьцяўляе дыктатуру пралетарыяту.

Таму, таварышы, вялікадзяржаўны шавінізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, галоўным ворагам якога мы павінны перамагчы для таго, каб пасьпяхова ажыцьцяўляць задачу сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

Ці ўвайшоў поўнасьцю і цалкам у жыцьцё тэзіс аб тым, што вялікадзяржаўны шавінізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай? Не, яшчэ не ўвайшоў, недастаткова ўвайшоў у жыцьцё гэты тэзіс. Гэта палажэньне яшчэ недастаткова намі ўсвоена і ў прыватнасьці саветам шмат трэба працаваць для таго, каб з гэтага палажэньня зрабіць усе неабходныя вывады і ўрокі, у першую чаргу ў галіне самай рашучай работы па ажыцьцяўленьні дырэктывы партыі аб беларусізацыі. Іменна тут — у слабым правядзеньні беларусізацыі — асноўнае поле для праяўленьня вялікадзяржаўнага шавінізму, які ўпарта супраціўляецца правядзеньню беларусізацыі, зрывае, затрымлівае гэту работу і пры недаволі пільных і настароженых адносінах да яго вылазак і самых рознастайных, часамі вельмі тонка замаскаваных, праяўленьняў, можа надоўга затрымаць, затрудніць у нас правядзеньне палітыкі поўнай беларусізацыі дзяржаўнага і савецкага апарату.

Высоўваючы тое сьцьвярджэньне, што галоўнай небясьпекай зьяўляецца вялікадзяржаўны шавінізм, мы праводзім і будзем праводзіць бязьлітасную барацьбу супроць усіх і ўсялякіх праяўленьняў і беларускага шавінізму, які прадстаўлен галоўным чынам у выглядзе грамадзка-палітычнай плыні, усім нам вядомай пад імем нацыянал-дэмакратызму.

Беларускі нацыянал - дэмакратызм, беларускі шавінізм зьяўляецца таксама, як і вялікадзяржаўны шавінізм, ідэйным багажом, зброяй клясавай барацьбы ў руках кулацтва і буржуазнай інтэлігенцыі.

Асноўныя, характэрныя рысы контрэвалюцыйнага беларускага нацыянал - дэмакратызму—гэта, па-першае, контрэвалюцыйная, шкодніцкая дзейнасьць. Сюды адносіцца добра нам вядомая «прыгэнаўшчына». Да характарыстыкі контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму адносіцца стаўка на інтэрвэнцыю, стаўка на тое, што савецкая ўлада ў БССР будзе скінута нападам капіталістычных дзяржаў і тады настане час для прыходу да ўлады абаронцаў клясавых інтарэсаў беларускага кулацтва.

Беларускі нацыянал-дэмакратызм для ажыцьцяўленьня сваіх мэт праводзіў паўную ідэалёгічную работу, прапаведуючы скрозь і ўсюды адзяўленьне клясавага распластаваньня беларускай вёскі, адмаўляючы існаваньне кулака, адмаўляючы наяўнасьць клясавай барацьбы, імкнучыся прытупіць клясавую чуласьць пралетарскіх элемэнтаў у горадзе і вёсцы, імкнучыся стварыць такую абстаноўку, пры якой-бы кулак мог зьбіраць сілы, расьці і ўзмацняцца.

Беларускі контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм ставіў сваю стаўку на зрыў нашай работы па нацыянальна-культурным будаўніцтве. Нацыянал-дэмакратызм асабліва актыўна імкнуўся сьпіхнуць наша нацыянальна-культурнае будаўніцтва на рэйкі будаўніцтва культуры буржуазнай, а не пралетарскай на сваім зьместе.

Вершы вартаны дыктатуры пралетарыяту — органы ДПУ ўзялі пад сваё «попечение» групу контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратычных дзеячоў — Цьвікевіча, Ластоўскіх, Лёскаў і інш. І мне здаецца, таварышы, што мы сёньня — увесь зьезд — можам вызваляць сваю поўную салідарнасьць з дзеяньнямі органаў ДПУ — вартавога пралетарскай дыктатуры (воплескі).

Вядома, буйной памылкай было-б лічыць, што на гэтым этапе наша барацьба з беларускім нацыянал-дэмакратызмам у асноўным ужо закончылася. Беларускі шавінізм, як і усе іншыя шавінізмы, ёсьць толькі адно з адлюстраваньняў клясавай барацьбы. Пакуль існуюць клясы, клясавая барацьба будзе знаходзіць свае адлюстраваньне ў форме розных праяўленьняў шавінізму.

Гэта патрабуе пастаяннай пільнасьці саветаў да ўсіх праяўленьняў шавінізму ўсялякіх масьцей, у тым ліку і ў першую чаргу да галоўнай небясьпекі—вялікадзяржаўнага шавінізму, да беларускага нацыянал-дэмакратызму, да шавінізмаў інш. масьцей і да прымірэнчых адносін да барацьбы супроць шавінізмаў.

Яўрэйскі шавінізм, польскі шавінізм і шавінізмы інш. адценьняў таксама падымаюць галаву, што, вядома, зьвязана з агульным абвастраньнем клясавай барацьбы.

Вядучы бязьлітасную барацьбу супроць усіх і ўсялякіх праяўленьняў шавінізму, адкуль-бы яны ня выходзілі, наша партыя будзе праводзіць далей сваю работу па выхаваньні працоўных мас у духу інтэрнацыянальнай салідарнасьці, у духу бр

За выразнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі ў практычнай рабоце

Рашуча палепшыць якасьць работы нізавых партыйных зьвеньняў у змаганьні за выкананьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі

Аб рабоце Гомельскай партарганізацыі

Пастанова ЦК УсеКП(б))*

Адзначаючы рад дасягненьняў Гомельскай партарганізацыі ў справе індустрыялізацыі раёну (павялічэньне ў 3 раз асноўнага капіталу гомельскай дзяржпрамысловасьці) і згуртаваньні сваіх радоў вакол генэральнай лініі партыі, ЦК адначасова канстатуе:

Размах капітальнага будаўніцтва гомельскай прамысловасьці (капіт 20 млн. рублёў за апошнія два гады), уцягненьне да 10 тысяч новых рабочых у прамысловасьць і транспарт Гомельскага раёну, рост гаспадарча-палітычнай актыўнасьці шырокіх рабочых мас,— усё гэта, стараючы спрыяючыя прадпасылкі для пасьпяховай барацьбы за выкананьне і перавыкананьне вытворчых праграм, патрабавала ад Гомельскай партарганізацыі рашучага паваротту тварам да вытворчасьці і перабудовы пад гэтым пунктам погляду работы ўсіх сваіх звеньняў.

Ня гледзячы на гэтыя спрыяючыя ўмовы, Гомельская партарганізацыя ня ўмела забясьпечыць выкананьне прамфінпляну на буйнейшых прадпрыемствах раёну (выкананьне вытворчай праграмы Гомсельмашам на 82 проц., фабрыкай «Вэзуві»—на 86 проц., фабрыкай «Праца»—на 25 проц. і інш.). Ня былі таксама асвоены асыгнаваньні на капітальнае будаўніцтва, плян якога выкананы у 1929-30 г. толькі на 60 проц.

Ня гледзячы на буйнейшае палітычнае і гаспадарчае значэньне Гомельскага чыгуначнага вузла, партарганізацыя не забясьпечыла адпаведнай увагі яго рабоце, у выніку чаго процант хворых паравозаў вырас да 9,2 проц., норма сярэдня-сутачнага прабегу таварных паравозаў недавыканана на 9,6 проц., прастой вагонаў вырасьлі да 16,1 проц. (норма 12 проц.), прагулы вырасьлі з 5 да 13 проц.

Такі стан работы прамысловасьці і чыгуначнага транспарту Гомельскага раёну тлумачыцца ў асноўным тым, што Гомельская партарганізацыя і асабліва гарком партыі не парабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі, якія сталі перад імі.

Гарком ня здолеў мабілізаваць партыйную і камсамольскую арганізацыю на барацьбу за ажыцьцяўленьне задач гаспадарчага будаўніцтва раёну, што ў прыватнасьці знайшло сваё выяўленьне ў надзвычайна нізкім процанце ахопу камуністаў і камсамольцаў сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам (ніжэй проценту ахопу беспартыйных рабочых).

Гарком і партарганізацыя ў цэлым ня здолелі арганізаваць актыўнасьць шырокай масы беспартыйных рабочых у справе выкананьня вытворчых праграм, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

З боку гаркому ня было праяўлена даволі ўвагі і дакладнасьці ў падборы кіруючых кадраў прадпрыемстваў у выніку чаго ў кіраўніцтве раду прадпрыемстваў апынуліся апартуністычныя элементы.

Адначасова ЦК адзначае вельмі слабое кіраўніцтва прамысловасьцю і чыгуначным вузлом Гомельскага раёну з боку кіруючых рэспубліканскіх органаў (ЦК КП(б)Б, ВСНГБ, праўленьня Заходніх чыгунак).

ЦК прапануе Гомельскаму гаркому і кіруючым рэспубліканскім арганізацыям неадкладна і рашуча выправіць адзначаныя недахопы і забясьпечыць поўнае выкананьне вытворчых праграм прамысловасьці і транспарту ў 1931 г., мабілізуючы на гэта партарганізацыю і шырокія рабочыя масы, дамагаючыся павялічэньня процанту ахопу сацспаборніцтвам і пераводу сацспаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшую ступень («сквозные» брыгады, плянавыя і рацыяналізатарскія групы, аўпаданьне тэхнікай вытворчасьці).

Работа чыгуначнага і воднага транспарту павінна стаць у цэнтры ўвагі работы партарганізацыі. Неабходна шырока папулярызаваць пастанову ЦК ад 10 студзеня і 5 лютага 1931 г. аб рабоце на транспарце, мабілізуючы масы на ліквідацыю прарываў і недахопаў у рабоце Гомельскага вузла і прыстаней. Асабліваю ўвагу зьвярнуць на хутчэйшае правядзеньне рэарганізацыі Гомельскага вузла, выкананьне пляну спэцыяльнага чыгуначнага будаўніцтва, а таксама на падбор сакратара-арганізатара вузла і стварэньне адпаведных умоў для яго работы.

ЦК КП(б)Б узяць пад свой непасрэдны нагляд работу Гомельскага чыгуначнага вузла і праз тры месяцы праверыць работу Гомельскай партарганізацыі пад пунктам погляду выкананьня дырэктыў ЦК па транспарце.

Адзначаючы недастатковы тэмп нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Гомелі, прапанаваць гаркому ў гадавы тэрмін скончыць у асноўным беларусізацыю парт.-сав. прафапаратаў і культурна-бытавых устаноў (школа, бібліятэка, клюб), пераходзячы ў гэтых органах на беларускую мову і рашуча выпучаючы на кіруючую работу падрастаючыя беларускія кадры. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на выпучэньне беларусаў у прэзыдыум гарсавету, нарасьветы, суд, пракуратуру, капэрацыю, кіруючыя партыйныя органы, а таксама на ўзьняцьце ўдзельнай вагі беларусаў у складзе рабочых гомельскай прамысловасьці і транспарту.

Партарганізацыі павесьці больш рашучую барацьбу з праявамі вялікарасійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекай у правядзеньні нацпалітыкі партыі (тэорыя «штучнай» беларусізацыі), узмацніўшы ў той-жа час выкрываньне і барацьбу з праявамі беларускага нацыянал-дэмакратызму, а таксама яўрэйскага і польскага нацыянал-шавінізму, выхоўваючы на гэтай барацьбе партарганізацыю і шырокія рабочыя масы ў духу ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Гаркому забясьпечыць культурна-бытавое абслугоўваньне нацыянальных меншасьцяй (школа, бібліятэка, друк, клюб) і вырошчваньне з іх асяродзішча пралетарскіх кадраў шляхам уцягненьня ў ВТНУ, ФЗУ, саўпартшколы, прадпрыемствы.

Рашуча павярнуць работу гарсавету, яго аддзелаў і сэкцый да важнейшых палітычных і гаспадарчых пытаньняў (нац.-культурнае будаўніцтва, узьняцьце абароназдольнасьці краіны, выкананьне прам. і трансфінпляну).

Адзначаючы недастатковае парткіраўніцтва шэфработай прадпрыемстваў над вёскай, ЦК абавязвае Гомельскі гарком карэнным чынам палепшыць пастаноўку шэфработы, асноўным зьместам якой павінна стаць актыўная садзейнасьць рабочых прадпрыемстваў у правядзеньні калектывізацыі, арганізацыі працы ў калгасах, выкананьні кампэраваньні бядняцка-серадняцкіх мас, арганізацыі ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці.

*) У вельмі скарочаным выглядзе дана пастанова, перададная па радыё, намі зьмешчана ў «Зьвязьдзе» № 48 ад 19-II-30 г.

Скаціліся з клясавых пазыцый

Брацкаўская ячэйка КП(б)Б (Касьцюковіцкі раён) ня справілася з тымі асноўнымі задачамі, якія перад ёю паставілі рэканструкцыйным пэрыядам. Парт'ячэйка ня здолела стаць на чале актыўнасьці бядняцка-сераднякіх мас вёскі і накіраваць яе на разгортваньне калектывізацыі, на ўзмацненьне націску на кулацтва.

Парт'ячэйка не вяла ніякай работы з батрацтвам і беднатой, апартуністычна ігнаравала гэту важнейшую палітычную задачу партыі. Сходы беднаты склікаліся ад выпадку да выпадку, толькі перад якой-небудзь кампаніяй. Кіраўнікоў груп беднаты, якія былі выдучаны на гэту работу толькі фармальна, ячэйка не заслухоўвала і ніякіх дырэктыў ім не давала. Безьдзейнасьць парт'ячэйкі скарыстоўвалі кулацкія элементы і разгортвалі сваю шалёную агітацыю супроць мерапрыемстваў партыі, асабліва супроць калектывізацыі. Сакратар ячэйкі Іваноў не разумее нават у самай элементарнай форме арганізацыйных прынцыпаў работы партыі сярод беднаты. Адсутнасьць работы і палітычна-клясавага выхаваньня беднаты зрабіла свой адбітак пры правядзеньні ўліку аб'ектаў абкладаньня. Пры правядзеньні гэтай работы у сельсавеце было рад грубых скажэньняў партыйнай лініі.

На тэрыторыі сельсавету ёсьць тры калгасы. Ячэйка іх работай не кіравала ў сувязі з чым у радзе калгасаў панове безгаспадарчасьць. Так, у калгасе «XII Кастрычнік» засталіся нескошанымі 5 тэкт. сенажаці, вельмі дрэнна догляд жывёлы, у сувязі з чым 12 авечак здохла.

Малацьба ў гэтым калгасе ня скончана.

Парт'ячэйка не накіроўвала актыўнасьць калгаснікаў на разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, зусім не займалася пытаньнем арганізацыі працы (зьдзельшчына ня ўведзена), не давала аднору ўсякім спажывецкім і рвацкім настроям з боку паасобных адсталых элемэнтаў. У калгасе «XII Кастрычнік» прымаюцца кулакі. Так, кулак Чыжоў і па сёньняшні дзень знаходзіцца ў калгасе і імкнецца ўзарваць яго знутры. Ячэйка зусім нічога не зрабіла для арганізацыі новага калгаснага прыліву. За апошні паўгод у калгасы сельсавету самацёкам улілося ўсяго толькі 34 гаспадаркі. У вогуле кіраўніцтва ячэйкі ў пытаньні далейшай калектывізацыі сельсавету узяло апартуністычную стаўку на самацёк.

Падрыхтоўчай работы да правядзеньня другой бальшавіцкай вясны не вядзецца, яна ня ўвязваецца з ажыцьцяўленьнем задачы па разгортваньні калектывізацыі. Ячэйка ня стала сапраўдным кіруючым штабам па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, па ўзмацненьні націску на кулака, да поўнай ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

На работу сельсавету ячэйка не зварачала ніякай увагі. У рэзультаце гэтага кіруючыя работнікі сельсавету груба скажалі партыйную лінію, што асабліва выразна выявілася пры ўліку аб'ектаў абкладаньня. Былі выпадкі, калі кіраўнікі сельсавету адкрыта станавіліся на абарону кулацкіх элемэнтаў, імкнуліся дапамагчы ім утоіць аб'екты абкладаньня з тым, каб кулацкія гаспадаркі не падпалі пад індывідуальнае абкладаньне. Так, былой памешчыцы Саковіч, якая на працягу раду год трымала на сваёй гаспадарцы двух батракоў, было вызначана падатку толькі ў суме 16 руб. Група беднаты вызначыла 18 гаспадарак для індывідуальнага абкладаньня, а прадстаўнік РВК Корапаў дамогся таго, што скасаваў гэту пастанову беднаты і ні адна гаспадарка з памянёных 18 у індывідуальным парадку абкладзена ня была.

Партыйная ячэйка не мабілізавала бядняцка-сераднякіх мас на выкананьне важнейшых палітычных і гаспадарчых кампаній, асабліва па загатоўках. Наадварот, сакратар парт'ячэйкі Іваноў, выступаючы па сялянскіх сходах, няправільна арыентаваў масы па пытаньнях выкананьня вызначаных плянаў па збожжазагатоўках і па загатоўках бульбы.

Па сельсавеце выяўлена 12 кулацкіх гаспадарак, якім даны цьвёрдыя заданьні па ўсіх відах загатовак. Але заданьні, даведзеныя да двара, да гэтага часу не спагнаны. Апартуністычная практыка сельсавету ў пытаньні націску на кулака давяла да таго, што цьвёрдыя заданьні па загатоўках кулакамі ня выкананы. Так, па збожжазагатоўках цьвёрдыя заданьні спагнаны толькі на 64 проц., па бульбе на 59 проц., па ільну—на 37 проц. і т. д. Усе важнейшыя гаспадарча-палітычныя кампаніі па сельсавеце ідуць самацёкам.

Усе гэтыя факты даводзяць, што і сельсавет і кіраўніцтва ячэйкі скаціліся з клясавых пазыцый, сталі на шлях адкрытай абароны кулацкіх элемэнтаў.

Бязумоўна, пры такіх умовах парт'ячэйка расла вельмі слаба. Наадварот, нагляделіся факты, калі апартуністы з ячэйкі штучна прыпынялі рост. На 10 лютага ў ячэйцы знаходзілася нераразгледжанымі 10 заяў калгаснікаў і беднякоў аб уступленьні ў партыю.

Гэтыя факты выразна паказваюць, што кіраўніцтва ячэйкі, скаціўшыся ў балота апартунізму, аказалася няздольным ажыцьцяўляць задачы партыі, пастаўленыя ў трэцім годзе пяцігодкі. Зусім правільна паступіў агульны сход ячэйкі, які сьняў апартуністычнае кіраўніцтва, выбраўшы ў склад бюро новых таварышоў, якія здолеюць пабальшавіцку змагацца за выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі.

Шчарбакоў А.

Мабілізавацца на разгортваньне калектывізацыі

Зэляноцкая парт'ячэйка (Мазырскі раён) абслугоўвае 5 населеных пунктаў. Яна здолела дабіцца значных посьпехаў у справе замацаваньня існуючых калгасаў. Аднак, далёка невыстарчальна працавала ячэйка ў галіне арганізацыі новага калгаснага прыліву.

Тэрыторыя, якую абслугоўвае ячэйка, калектывізавана на 15,6%. Аднак, гэтыя посьпехі трэба аднесьці не да апошняга, а папярэдняга перыяду дзейнасьці ячэйкі. За 1930 год прырост калектывізацыі раўняецца толькі 1 проц. Гэта далёка невыстарчальна.

Усяго ў раёне дзейнасьці ячэйкі налічваецца 6 калгасаў, 4 а іх у гаспадарчых адносінах больш-менш замацаваны, а ў астатніх двух ёсьць рад адмоўных зьявішч. Напрыклад у калгасах імя БАП і «Зьвязды» не вядзецца амаль ніякай работы сярод калгаснікаў і ў першую чаргу былых батракоў і беднаты. У рэзультаце гэтага наглядаецца недыцыплінаванасьць, скалкі, рвацтва, што бязумоўна ня можа не адбівацца на гаспадарчым становішчы калгасу. Калгасам не скарыстана 270 руб. крэдыту, адпушчанага на будаўніцтва.

Ячэйка ня стала на чале актыўнасьці калгасных мас, не разгарнула сярод іх сацыялістычных мэтадаў працы: ударніцтва і сацспаборніцтва.

Ячэйка слаба кіравала работай сельсавету, што дало магчымасьць паасобным кіраўніком сельсавету ў сваёй практычнай рабоце праводзіць апартуністычную практыку. На працягу 1931 году сельсавет нават ня меў пляну работы, бязьдзейнічаў у выкананьні важнейшых палітычных і гаспадарчых кампаній. Такое пытаньне, як разгортваньне кантрактацыі, зусім выпала з пад увагі дзейнасьці сельсавету.

Палітычна-масавая работа сярод беднаты і серадняковаў аднаасобнікаў не разгорнута. Хаты-чытальні (а іх тут дабе) ня сталі яшчэ на шлях прапаганды ідэі калектывізацыі.

Падрыхтоўка да веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі яшчэ не разгорнута. Рамонт машын, ачыстка насеньня не пачаты.

Партыйная ячэйка павінна ўзяць баявы тэмп у рабоце і з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за выкананьне тых задач, якія паставіла партыя ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Брыгада: Залесін, Шумскі, Курчыцкі.

Пераключыцца на ліквідацыю прарываў

Даятлавіцкая парт'ячэйка (Гомельскі раён) на сваёй колькасьці ненялікая: яна складаецца з 8-мі членаў партыі. Абслугоўвае ячэйка Даятлавіцкі сельсавет і часткова Шарпілаўскі і Рудня-Марымонаўскі.

Ячэйка з асноўнымі палітычна-гаспадарчымі кампаніямі, якія праводзіліся партыяй на вёсцы, справілася. Дасягнуты апачныя посьпехі ў справе калектывізацыі. За апошні час арганізаваны і афармлены калгасы ў Даятлавічах і пасёлку Чарніча. Адначасова ўзбудзены калгас «Чырвоны партызан».

Аднак, у рабоце ячэйкі быў цэлы рад дзіўных буйных прарываў. Яны выявіліся ў тым, што ў радзе калгасаў паасобныя кіраўнікі ня толькі не дазвалялі новага прыліву, а часамі яго штучна тармазілі. Заявы, падаваныя беднякамі і серадняковамі — аднаасобнікамі на некалькі месяцаў не разглядаліся.

Ячэйка дрэнна паставіла работу сярод беднаты ў калгасе «Чырвоны партызан». У гэтым калгасе прыпоўная дысцыпліна сярод калгаснікаў дрэнная, ударніцтва і сацспаборніцтва не разгорнуты. Кіраўніцтва калгасу ня здолела стаць да чале актыўнасьці мас, не накіравала яе на гаспадарчае замацаваньне калгасу. Так, частка ўраджаю засталася на полі нябранай, малацьба яшчэ не закончана, не скарыстоўваецца ўсе магчымасьці для таго, каб гаспадарча замацаваць калгас.

У гэтым калгасе ёсьць некалькі членаў партыі. Яны сярод калгаснікаў не зьяўляюцца ня толькі прыкладам, а наадварот, плятуцца ў хвасьце паасобных адсталых элэмэнтаў. Напрыклад, пры разьмеркаваньні ўраджаю, а боку члена партыі Чыбукова было дапушчана рвацтва. Ён, імкнуўся да таго, каб правесьці разьмеркаваньне ўраджаю баз уліку прапоўных дзён. Парт'ячэйка на гэты факт не рэагавала.

У ячэйцы зусім слаба разгорнута крытыка і самакрытыка. Былі моманты, калі самакрытыку зацісклі, а ячэйка не змагалася за бальшавіцкае разгортваньне крытыкі і самакрытыкі.

Парт'ячэйка павінна мабілізаваць усіх членаў партыі на выразнае выкананьне дырэктыў партыі аб разгортваньні калектывізацыі, аб узмацненьні націску на кулацтва, да поўнай яго ліквідацыі, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Б. Р.

За тэмпы! За якасьць!

(З ЗАЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯ)

Прэзыдыум зьезду

— Слова мае тав. Галадзед.

— Два з паловай гады. Гэты параўнаўча невялікі прамежак часу аддзяляе нас ад мінулага — 9-га зьезду саветаў. Невялікі колькасна — гэты перыяд азначае сабою новы вышэйшы этап пралетарскай рэвалюцыі.

***

Пралетарыят і працоўныя масы БССР атрымалі рашаючыя перамогі на фронце будаўніцтва сацыялізму.

У краіне здбыліся вялізарнейшыя сацыяльна - эканамічныя зрухі.

На грунце суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца кулацтва як клас.

У рашучай барацьбе з апартунізмам усіх адценьняў, з вялікадзяржаўным і іншымі шавінізмамі, з контр - рэвалюцыйным беларускім нацыянал - дэмакратызмам мы разгортваем наступленьне сацыялізму па ўсім фронце.

У нас у асноўным ліквідавана беспрацоўе.

Расьце індустрыя. Шырыцца сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, усё вышэй узьдымаецца новы калгасны прыбой.

Мы прыступілі да завяршэньня пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі.

***

Гэты пэрыяд, — падкрэсьлівае тав. Галадзед, — пераломны і для капіталістычнага сьвету.

Там ён азначае заняпад. Часовая стабілізацыя «канула в бездну» эканамічнага крызісу.

Разгортваецца наступленьне на рабочую клясу. З начуванай хуткасьцю расьце армія беспрацоўных. Перапляталючыся з аграрным, эканамічны крызіс перарастае ў палітычны, падрываючы асновы сусьветнага капіталізму.

Абвастрэньне супярэчнасьцяй капіталістычнай сыстэмы дасягнула вышэйшага пункту.

У газэтах і часопісах усё часьцей чуюцца роспач і безпаманошныя енкі.

***

На гэтым фоне адбываецца кансалідацыя рабочае клясы. Нарастае магутная хваля рэвалюцыйнага руху.

Забастоўкі, партызанскія выступленьні, галодныя паходы — вось бураносьнікі рашаючых боек.

У іх крызіс.

У нас—бурны сацыялістычны рост. Пад кіраўніцтвам партыі рабочая кляса і працоўныя масы на аснове магутнага ўздыму энэргіі і творчага энтузіязму ўвенчаюць рашаючыя посьпехамі выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Прадстаўнікі Чырвонай арміі вітаюць зьезд

У пяцігоды прад савецкай пяцігодкай буржуазія ўсіх краін разьвівае шалёную антысавецкую работу.

Блёк Малой Антанты, канфлікт на Кітайска - Усходняй чыгунцы, палёты на савецкія прадстаўніцтвы, эканамічная згода Польшчы з Румыніяй, пікель наш машына ў нашым паўпрэдзьве ў Варшаве, «крыжовы паход», пан-Эўрэпа, кампанія супроць савецкага «дэмпінгу», за эканамічную блёкаду СССР, і апошняя сьвістапляска аб «прымусовай працы»—вось паказальнікі ўзмоцненай падрыхтоўкі ваеннага нападу на СССР.

Махінацыі падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР асабліва поўна выкрыты на працэсе «прампартыі».

— Мы з дакументамі ў руках паказалі ўсяму сьвету сапраўдную сутнасьць капіталістычнай балбатні аб разбраеньні.

— Мы павінны быць на пагатове, кожны дзень можна чакаць нападу.

Справа гонару кожнага пралетара, кожнага працоўнага — аўладаць ваеннымі ведамі. Гэта асабліва важна для нас—фарпосту Савецкага Саюзу.

На далёкім Усходзе мы паказалі капіталістам моц Чырвонай арміі. Мы ў любы момант зможам аднавіць апэрацыі Далёка-Ўсходняй.

Вуснамі тав. Галадзеда, пад бурную авацыю, зьезд заяўляе:

— Няма ў сьвеце такой моцнай арміі, як наша слаўная Чырвоная. Сіла яе—у вялікай клясавай сьвядомасьці.

— Ударная калёна сусьветнага пралетарыяту — заўсёды на варце.

***

— Пяцігодка, — гаворыць тав. Галадзед, — ператварае БССР у магутную індустрыяльна - аграрную краіну з прамысловымі гігантамі, сацыялістычнымі фабрыкамі с.-г. прадуктаў і буйнымі калгасамі жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

За першыя два гады па валавой прадукцыі народнай гаспадаркі БССР мы дасягнулі 31 проц. меркаваньняў пяцігодкі.

1931 год дасьць 60 проц.

Па капітальных укладаньнях у прамысловасьць у 1931 годзе мы дасягаем 72,3 проц. таго, што меркавалася паводле пяцігодкі.

Рост валавой прадукцыі і капітальных укладаньняў вызначае нашы тэмпы і найбольш ярка характарызуе нашы посьпехі ў выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

У справе павялічэньня фонду зарплаты рабочых мы прышлі да зьезду з выкананьнем на 15,4 проц. намячэньняў пяцігодкі.

Фонд па страхаваньні ўжо зараз перавышае меркаваньні пяцігодкі на 32,5 проц.

У рады індустрыі становяцца дзесяткі новых прадпрыемстваў, пабудаваных паводле апошняга слова тэхнікі.

Асінстан, Гомсельмаш, Магвапакнабуд, бабруйскі камбінат, швэйныя фабрыкі, крухмальныя заводы — вось первенцы двох год вялікай пяцігодкі.

— Адзначаючы нашы посьпехі, — гаворыць тав. Галадзед, — трэба з усёй сілай падкрэсьліць і нашы слабыя месцы.

Мы аддавалі невыстарчальную ўвагу справе электрыфікацыі, а між тым гэтай галіной асабліва цікавіліся шкоднікі.

На аснове перабудовы сельскае гаспадарка на сацыялістычны лад узрастае валавая і таварная прадукцыя яе.

Ужо 1930 год дае 59,5 проц. таварнай прадукцыі, тэй прадукцыі, што меркавалася па пяцігодцы. Пры гэтым калгасны сэктар дасягае 63,3 проц.

1931 год будзе адзначан перавышэньнем пяцігодкі па таварнасьці сельскай гаспадаркі на 40,6 проц.

Тахнічная база, машынізацыя — важнейшы ватар уздыму сельскай гаспадаркі.

173 трактары ў 1928 годзе і 2.360 — у 1931 годзе — вось бальшавіцкі адказ на апартуністычныя енкі аб дэградацыі.

З валікай упартасьцю мы пітурмуем вышыні жывёлагадоўчай праблемы.

Наш шлях — калектывізацыя. Іменна на гэтай аснове мы ў 1931 годзе будзем мець 257 тыс. сьвінаматак. 50 проц. усяго стада жывёлы будзе ў сацыялістычным сэктары.

17 проц. калектывізацыі — лічба малая. Самае важнае, самае каштоўнае заключаецца ў тым, што калгасы ў першы год паказалі перавагу. Рост ураджайнасьці азімых на 8,4 проц. супроць 7,5 проц. індывідуальнага сэктару і 9,3 проц. па аўсе супроць 7,3 — лепшы агітатар за буйную калгасную гаспадарку, адзін з стымулёў калгаснага руху.

***

Уэмацніць тэмпы, стаць на адзін узровень з сярэднім процантам калектывізацыі па ўсім Саюзе — галавая задача дня.

Мовай лічбаў палых дасягненьняў ва ўсеагульным навучаньні, дашкольнай асьвеце, у кнігавыданьні, літаратуры тав. Галадзед дэманструе перад зьездам вынікі практычнай рэалізацыі лёзунгу будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце.

— Мы ня маем права аспавяць тэмпы. Адсталых, — гаварыў тав. Сталін, — б'юць.

Наша задача:

— Уэмацніць энэргетычную базу, асаблівую ўвагу — торфу, жорсткая эканоміі аналу, дабівацца хутчэйшай эфэктыўнасьці ад укладаемых капіталаў, будаваць хутка і танна, біцца за якасьць!

***

— Усю ўвагу савецкіх і грамадзкіх арганізацый — на вырашэньне важнейшых праблем у сельскай гаспадарцы.

— Патрэбна ліквідаваць руйнуючы апошь супроць недавацэнкі стварэньня кармавой базы — гэтай неабходнейшай умовы для вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы.

Тав. Галадзед з асаблівай сілай падкрэсьлівае неабходнасьць хутчэйшай ліквідацыі прарываў у справе загатовак.

— Мы ня маем права ехаць на Ўсесаюзны зьезд з прарывамі на гэтым фронце.

Бурнымі воплескамі сустракае зьезд прапанову аб пасылцы делегацыі дэпутатаў зьезду ў раёны для ўзмацненьня работы ў галіне загатовак.

— Сацыялізм будуецца ў жорсткіх бойках з клясавым ворагам. Пасьпяхова рушыцца наперад — гэта значыць рашуча ажыцьцяўляць палітыку ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, выкрываць і біць ворага, пад якой-бы маскай ён не захоўваўся.

Будаваць сацыялізм — гэта значыць біцца за тэмпы, за якасьць, супроць апартуністаў усіх адценьняў, узмацняць сувязь рабочае клясы з асноўнымі масамі селянства на новай вышэйшай базе, узьняць на вялікую вышыню арганізацыйную і палітычную ролю саветаў.

Пад сьцягам партыі, пад кіраўніцтвам ЦК і выпрабаванага ленінца, правадыра партыі — тав. Сталіна — наперад да новых перамог! — канчае свой даклад т. Галадзед пад гучныя воплескі.

Хроніка зьезду

Учора на вячэрнім пасяджэньні па дакладу тав. **Галадзеда** разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Дэлегаты спынялися на дасягненьнях, якія мы маем за час ад 9-га да 10-га Ўсебеларускага зьезду, таксама адзначаючы нявыразнасьць і нягібкасьць работы асобных зьвеньняў нашага апарату.

— У спрэчках выступілі новы прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук — тав. **Горын** і начальнік ПУР'а БВА — т. **Аранштам.**

— Зьезду рапартавала дэлегацыя другой беларускай чырвонасьцяжнай дывізіі імя Фрунзэ.

— Дэлегацыя Плешчаніцкага райкалгасзьезду рапартавала аб сваіх дасягненьнях.

Дэлегацыя ад працоўных раёну патрабавала назваць Плешчаніцкі раён імем тав. Мянжынскага.

— Дэлегацыя чырвоных партызан вітае зьезд ад імя першага ўсебеларускага зьлёту чырвоных партызан.

— Тав. **Рапапорт** ад імя прэзыдыуму зьезду адказваў на прывітаньні партызанаў.

— Зьездам атрыманы прывітальныя тэлеграмы ад Сураскага раённага зьезду калгасаў, ад менскага гідратэхнікуму, ад бедняковаў і серадняковаў в. Запольле, Пятрыкоўскага раёну, ад другой Мар'іна-Горскай канфэрэнцыі груп беднаты, ад Лепельскай с.-г. арцелі «Чырвоная жэжліна», ад першай канфэрэнцыі закрытага каапэратыву віцебскай фабрыкі «Дзьвіна».

— Сёньня будуць працягвацца спрэчкі па дакладу т. **Галадзеда.**

Лом—мартэнам

Паход за ломам разгортваецца вельмі марудна

Саюз мэталістаў гэтай справай ня цікавіцца

Трэцяя пяціднеўка лютага ня прынесла ніякага зруху ў справе загатоўкі мэталялому. Менскае агенцтва выкапала заданьне на 75 проц., Віцебскае — на 41,6 проц., Гомельскае — на 35,8 проц., Магілёўскае агенцтва не дало паваг вестак аб зборы лому.

Адказныя работнікі беларускай канторы «Мэталялом», якія выехалі ў гэтыя гарады для непасрэднага кіраўніцтва паходам за ломам, пакуль не дабіліся зруху ў рабоце і не падтрымліваюць сувязі з цэнтральнай «пяцёркай» па кіраўніцтве месячнікам. Два члены «пяцёркі»—сакратар парт'ячэйкі «Мэталялому» **тав. Дубавік** і старшыня групкому № 2 мэталістаў **тав. Пукала,** работы па ліквідацыі прарыву не вядуць, нават ня цікавіцца становішчам забесьпячэньня ломам заводаў мэталюргічнай прамысловасьці. «Пяцёрка» яшчэ ні разу не заслухала інфармацыі кіраўніка канторы «Мэталялому» аб ходзе ліквідацыі прарываў.

Асабліва недапушчальным зьяўляецца пасыўнасьць групкома мэталістаў. Яго абавязак—перавесьці збор лому на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Але групком нават ня цікавіцца тым, як выконваецца дагавор на сацспаборніцтве з Заходняй канторай «Мэталялому».

Гарком партыі і гарком камсамолу, якія ведаюць аб становішчы са зборам лому, ня прымаюць належных мер супроць тых, хто фактычна тармозіць збор і адгрузку лому.

Да тых асоб, прозьвішчы якіх «Зьвязда» ужо прыводзіла (гл. № 47) можна яшчэ дадаць кіраўнікоў Белмэталпаб'яднаньня, Белкаапсаюзу і Ўцільзяржгандлю.

Прафсаюзы, асабліва саюз мэталістаў, яшчэ не расчачаліся, хоць ад пачатку падрыхтоўкі да месячніка прайшло ўжо пяць дзён.

Калашнікаў.

Работу па збору лому правяраць кожныя 5 дзён

Азнаёміўшыся з лістом старшыні прэзыдыуму ВСНГ СССР тав. АРДЖАНІКІДЗЭ ад 9 лютага аб выкананьні збору мэталялому для заводаў на працягу студзеня, прэзыдыум БЕЛБЮРО ЦК ЧЫГУНАЧНІКАЎ пастанавіў УКЛЮЧЫЦЦА У МЕСЯЧНІК ЗБОРУ ЛОМУ, пачаўшы яго з 20 лютага пасьля адпаведнай падрыхтоўкі.

Прэзыдыум Белбюро прапанаваў УСІМ РАЙПРАФСАЧАМ, МЯСЦКОМАМ І ЦЭХКАМІТЭТАМ ажывіць работу штабаў па зборы лому, ЗЬМЯНІЎШЫ НЯЗДОЛЬНЫХ ПРАВОДЗІЦЬ ГЭТУ РАБОТУ ПА-БАЯВОМУ ЛЕПШЫМІ УДАРНІКАМІ. КОЖНЫЯ 5 ДЗЁН РАБІЦЬ МАСАВУЮ ПРАВЕРКУ ХОДУ ВЫКАНАНЬНЯ КАНТРОЛЬНЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ПА ЗБОРЫ ЛОМУ. Скарыстаць газаты, кіно, пёзунгі, радыё для папулярызацыі важнасьці збору лому. Для пасьпяховага правядзеньня месячніка разгарнуць пяраліччку ў парадку сацспаборніцтва паміж цэхамі, арцелямі і станцыямі аб ходзе збору лому, арганізаваць суботнікі і «сквозные» брыгады.

Скарыстоўваць чорныя і чырвоныя дошкі, на якія заносіць МЯСЦКОМЫ, ЦЭХКАМІТЭТЫ І АДМІНІСТРАТАРАЎ, у залежнасьці ад іх удзелу ў гэтым месячніку. АРГАНІЗАВАЦЬ КАНТРОЛЬНЫЯ БРЫГАДЫ І ПАСТЫ ДЛЯ НАГЛЯДУ ЗА СВАЯЧАСОВАЙ ПАДАЧАЙ ВАГОНАЎ, ПАГРУЗКАЙ І АДПРАЎКАЙ ЛОМУ НА ЗАВОДЫ. На працягу месячніка трэба дабіцца, каб поўнасьцю ўсе слупы і іншыя мэталёвыя часткі, згодна загаду НКШЗ, былі заменены драўлянымі. Мабілізаваць грамадзянскасьць вёскі, у першую чаргу ў палюсфэрных раёнах і сельсаветах, для збору і здачы лому ў каапэрацыі.

Планы месячніку павінны быць складзены з такім разьлікам, каб ня толькі выканаць, а ў парадку сустрэчных прапаноў перавыканаць кантрольныя ліміты па зборы лому. Пачынаючы з 20 лютага райпрафсачы павінны кожныя 5 дзён пазнаёмляць Белбюро аб ходзе збору лому. Вестні гэтыя прэзыдыум Белбюро пастанавіў АПУБЛІКОЎВАЦЬ У ДРУКУ.

ДАМО СЫРЭЦ

бульба—апрацоўчым заводам

Ліквідаваць прарыў на бульбазагатоўчым фронце

Бульба-апрацоўчая прамысловасьць БССР стаіць перад рэальнай пагрозай спыненьня ўсіх прадпрыемстваў. Рад заводаў і цэлы працуюць з перабоямі, ня маючы поўнай нагрузкі.

Такое становішча стварылася дзякуючы таму, што загатоўчыя арганізацыі па месцах па-апартуністычнаму недааценілі ўсёй важнасьці выкананьня плянаў бульбазагатовак ад чаго залежыць нармальны ход работы прадпрыемстваў бульба - апрацоўчай прамысловасьці.

Узоры ганебнага адставаньня і поўнай бязьдзейнасьці паказваюць **Азарыцкі** раён, які выканаў плян загатовак усяго на 6 проц., Бягомльскі—па 11 проц., Быхаўскі—на 16 проц., Гарадоцкі—на 15 проц., Жлобінскі—на 19 проц., Журавіцкі—на 8 проц., Копыскі—на 21 проц., Лупалаўскі—на 21 і Рэчыцкі—на 20 проц.

Загатоўчыя арганізацыі гэтых раёнаў, спадзяючыся на самацёк, нічога не зрабілі для таго, каб сапраўды пабаявому выканаць намечаныя пляны бульбазагатовак.

Мясцовыя партыйныя, савецкія і прафэсыянальныя

Напярэдадні 13-ай гадавіны Чырвонай арміі

ВЫСОКАЙ ТЭХНІКІ
ПАТРАБУЕ АБАРОНА КРАІНЫ

Дапаможам матарызацыі Чырвонай арміі—узмоцнім фонд шасьцікалёсных аўтамабіляй

У барацьбе за аўладаньне тэхнікай

Аўтадораўскі рух узьнік тады, калі нарокал савецкая грамадзкасьць упяршыню пачула трывогу за наш бязрэйкавы транспарт, калі яна пачала ўсьведамляць, што пры нашых непраходных дарогах нельга думаць аб колькі-небудзь пасьпяховай рэканструкцыі наднаце гаспадаркі. І толькі тым, што гэта думка, гэта трывога стала ўсёшыбей прасякаць у петры рабочае масы, магчама вытлумачыць надзвычайны посьпех аўтадораўскага руху, які па адпаў БССР за трохтадовае існаньне таварыства «Аўтадор» яднае больш 50 тыс. членаў Аўтадору.

Шляхам арганізацыі цэлага раду гурткоў, курсаў і школ па розных галінах работы таварыства — аўтамабільнай, трактарнай і шляховай справах, арганізацыі беларускага Аўтадору ужо ахопілі некалькі тысяч чалавек кіроўшкоў, трактарыстаў і дарожных дзеятнікаў. На сёньняшні дзень, паводле апошніх даных, сяткай гурткоў, курсаў, Аўтадору ахоплена па БССР звыш тыс. чалавек. У дапамогу веснавой асеўнай кампаніі Аўтадор выпускае сваіх курсаў 100 трактарыстаў і 50 шофэраў—(раней было выпушчана 50 трактарыстаў і 100 шофэраў).

Лёзунг камуністычнай партыі «аўладаць тэхнікай»—ставіць перад аўтадораўскімі арганізацыямі вельмі вялікія задачы. Неабходна сваю работу будаваць ня толькі вакол аўтамабіля, трактара і дарогі, але наогул вакол пытаньняў разгортваньня тэхнічнай прапаганды і яе ажыцьцяўленьня ў практычнай рабоце. Аўтадор—масавая тэхнічная пралетарская арганізацыя, якая клікана дапамагчы партыі і савецкай уладзе ў будаўніцтве сацыялізму абароне краіны. Задача аўтадораўскіх арганізацый—ня вузка замыкацца ў пытаньнях вярбоўкі новых членаў, аўтанучобы і рэалізацыі лётарэйных білетаў, а штодзенна прымаць удзел у разьвіцьці ўсіх палітычных кампаній, якія праводзяцца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Падрыхтоўка да другой бальшавіцкай весны патрабуе ад усіх аўтадораўскіх арганізацый максімальнай увагі. Аўтадораўскія арганізацыі павінны ўзяць пад асобны нагляд трактарныя майтэрні, неабходна дабіцца сваячасовага якаснага рамонту трактараў і с.-г. машын, аўтадораўскія арганізацыі павінны выдумць брыгады спэцыялістаў для дапамогі калгасам у прыведзеньні трактарнага парку і с-г. машын у баявую гатоўнасьць. Нельга абмежавацца аднымі разважаньнямі, а неабходна практычна правесьці гэта ў жыцьцё.

Шпаркі тэмп аўтамабілізацыі краіны і патрэбы абароны—на усю пырыню ставяць пытаньне аб палепшэньні становішча нашых дарог. З 100 тыс. клм. дарог БССР шашыравана толькі каля 1 проц. Гэта лічба паказвае наколькі мы адсталі ў галіне дарожнага будаўніцтва.

Шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны, шпаркая калектывізацыя сельскай гаспадаркі патрабуе мільёнаў аўтамабіляў, а іх пакуль што мала. Пяцігодка павінна даць на БССР 24 тыс. аўтамабіляў і ўжо з гэтага году мы рэальна пачынаем адчуваць патрэбу ў машыне. Транспарт усё яшчэ зьяўляецца вузкім месцам у сыстэме нашай народнай гаспадаркі і да яго пашырэньня павінна быць прыцягнута ўся шырокая савецкая грамадзкасьць, у першую чаргу аўтадораўская.

Водны транспарт вельмі адстаў. Матарызацыя водных шляхоў зносін на БССР амаль што не праводзіцца. Маторных лодак на БССР маецца толькі... 33, з якіх некаторая колькасьць не на ходу. Гэта вымушае аўтадораўскія арганізацыі вельмі значную ўвагу аддаць пытаньням разгортваньня водна-маторнага транспарту. Мы ў некаторых пунктах арганізоўваем свае водна-маторныя базы, але гэтага мала... Неабходна дабіцца атрыманьня матораў, матарызацыі лесасплаву, рыбных промыслаў і г. д.

Аднак, ня трэба захапляцца толькі вузкім дзяліцтвам. Усе нашы арганізацыі павінны памятаць, што Аўтадор—гэта масавая пралетарская грамадзкая арганізацыя, якая дапамагае партыі будаваць сацыялізм. Трэба пры ўсіх нашых арганізацыях стварыць моцны актыў аўтадораўцаў для таго, каб ня вузкіца са шляхоў грамадзкай самадзейнасьці і ініцыятывы на шлях бюракратычнага ведамства. Трэба перавесьці дарожную павіннасьць на рэйкі вялікага масавага руху пад сьцягам Аўтадору. Усе гэтыя пытаньні трэба прадумаць і даць ім цьвердую практычную ўстаноўку.

Толькі так мы пераключым мільённую аўтадораўскую арганізацыю з часткова халастога ходу на прыкладаньне гэтай энэргіі да ўсіх вагароў сацыялістычнае гаспадаркі і сацыялістычнага будаўніцтва.

ГОРДЗІН.

Асоавіяхімаўская работа іх не датычыць

Лёзунг партыі—узмацняць абароназдольнасьць краіны, узмацняць Асоавіяхім зусім не датычыць партыйнай арганізацыі і ячэйкі Асоавіяхіму папаровай фабрыкі «Спартак».

Нават праведзеная «дэкада абароны» е захапіла «Спартака», і гэта наглядзецца там, дзе для працы ёсьць шырокі размах.

Фабрыка «Спартак» налічвае каля 700 рабочых і служачых. Але ці прымаюць ны які-небудзь удзел у працы Асоавіяхіму? Наперад можна быць упэўненым, што большасьць адкажа, што ня адае, што ці ёсьць такая арганізацыя а фабрыцы, ці не.

Частка рабочых зьяўляецца членамі Асоавіяхіму, але апроч уплаты членскіх узносаў, больш нічога і ня робяць.

Гэта цягнецца ўжо ня першы год і калі неравыбралі савет, то новы старшыня савету зьвярнуўся ў парткалектыў з просьбай, каб дапамаглі зрушыць асоавіяхімаўскую працу з месца. Пабяцалі склікаць сход, накіраваць на вывучэньне вайсковай справы ўсіх камсамольцаў, але гэта засталося абяцаньнем.

Пры фабрычным клюбе ёсьць і вайсковы куток.

Летась пры гэтым вайсковым кутку існаваў хоць невялічкі вайсковы гурток, а сёлета і гэтага няма.

Кампаніі па ўзмацненьні сродкаў Асоавіяхіму, якія праводзяцца савецкай грамадзкасьцю, зусім не датычаць фабрыкі. І гэта не таму, што рабочыя супроць гэтых кампаній, а таму, што савет Асоавіяхіму ні кіруе, не зьяўляецца арганізацыйным пачаткам. Не дарма, што падпіска сярод рабочых, на білеты лётарэі Асоавіяхіму, на пабудову дырыжабля, зусім нязначная.

Такое становішча павінна быць зьнічтана. Ячэйка Асоавіяхіму павінна распачаць сваю работу.

Вайсковы.

Мацуем магутнасьць Чырвонай арміі

Ячэйка Аўтадору пры плода-гароднінай базе ўносіць на пабудову шасьцікалёсных аўтамабіляў для Чырвонай арміі 218 руб. і выклікае пасьледваць іх прыкладу ячэйку пры праўленьні МЦРК, а таксама 2 і 3 групкомы, заводы «Энэргія», «Бальшавік», «Камунар» і Дрэваапрацоўшчык».

Полацкае аддзяленьне Аўтадору перавяло ў фонд пабудовы шасьцікалёсных аўтамабіляў 1.000 рублёў і выклікае ўсе астатнія раённыя аддзяленьні Аўтадору.

Капыльскае раённае аддзяленьне Аўтадору ўносіць першы ўзнос у суме 70 руб. і выклікае Слуцкае і Грэскае аддзяленьні Аўтадору.

Аршанскае аддзяленьне Аўтаду ўносіць першы ўзнос у 270 руб. і выклікае Віцебскае і Магілёўскае аддзяленьні Аўтадору.

Нарада-курсы старшынь райпрафсаветаў упосяць 100 руб.

Гомельскае аддзяленьне Аўтадору ўключылася ў кампанію па збору сродкаў на пабудову шасьцікалёснага аўтамабіля «Аўтадоравец Беларусі».

Бабруйскае аддзяленьне Аўтадору адлічыла 2 проц. з прыбытку аўтапарку за 1930 год у суме 700 рублёў у фонд пабудовы шасьцікалёсных аўтамабіляў.

Менскае аддзяленьне Аўтадору сабрала ў фонд шасьцікалёсных машын 700 рублёў. Збор працягваецца.

Усяго ў гэты фонд паступіла 2.800 руб.

М. В.

Возьмемся за ваеннаморскую работу

Юбілей Чырвонай арміі цалкам і поўнасьцю выкарыстоўваецца намі на ўзмацненьне раду работ у галіне далейшага ўмацаваньня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу. Лепш начынаюць працаваць грамадзкія арганізацыі, у падрыхтоўку юбілею ўцягваюцца тысячныя масы рабочых, але з году ў год забываецца такая важная галіна работы, як ваенна-морская падрыхтоўка.

Ні камсамол, ні Асоавіяхім ніколі ня ставілі пытаньня аб разгортваньні і пастаноўцы ў Менску і нават у Беларусі ваенна-морской падрыхтоўкі, ня гледзячы на тое, што беларускі камсамол зьяўляецца шэфам над адным з буйнейшых баявых суднаў нашага чырвонага флёту.

А між тым, у Менску ёсьць некалькі дзесяткаў дэмабілізаваных чырвонафлётцаў, якія трацяць сваю кваліфікацыю як спэцыялісты-чырвонафлётцы.

Трэба, каб камсамол і Асоавіяхім арганізавалі кароткатэрміновыя вячэрнія курсы пры Доме Чырвонай Арміі для паўтарэньня ваенна-морской вучобы, дзе дэмабілізаваныя чырвонафлётцы папоўняць і асьвяжаць свае веды.

Трэба тэрмінова склікаць сход усіх чырвонафлётцаў, абмеркаваць пытаньне аб вучобе, арганізацыі водных станцыі па прыкладзе Масквы і іншых гарадоў і сур'ёзна ўзяцца за ваенна-морскую падрыхтоўку.

Гэта будзе нашым скромным падарункам да 13-ай гадавіны Чырвонай арміі.

Рабочы друкарні імя Сталіна
М. КРАВЕЦ.

Няма вайсковай работы ў калгасах Лупалаўскага раёну

Ня гледзячы на тое, што № полк супольна з раённымі арганізацыямі Лупалаўшчыны вядзе агляд вайсковай работы, калгаснікі яшчэ не раскачаліся.

На тэрыторыі 2-х сельсаветаў знаходзіцца 6 калгасаў, трэба было-б весьці сапраўдную работу, а яна ў калгасах праходзіць нелк самацёкам.

Калгасы ў справе ваяніізацыі жывуць старыцкай. Праводзяцца ўрачыстыя сходы, прымаюцца рэзалюцыі, робіцца збор трашовых сродкаў на абарону, але сыстэматычнай работы па павышэньні баявой пісьменнасьці няма.

У калгасах вайсковыя групы работы не вядуць, дэмабілізаваныя чырвонаармейцы, малодшыя камандзіры і ў тым ліку пераменьнікі, не зьяўляюцца арганізатарамі вайсковай работы.

САУТКІН.

Недаацэньваюць нізавы вайсковы друк

Яшчэ за месяц да гадавіны РСЧА № эскадрон сувязі разам з шэфамі заводу «Камунар» узгаднілі пытаньне аб сьвяткаваньні гадавіны.

Складі плян, куды ўключылі выпуск спэцыяльнага друкаванага нумару газэты. Аб гэтым вельмі дэтальна дагаварыліся з рэдакцыяй.

Далі заданьне асобным асобам і тэмы, на якім трэба пісаць артыкулы. Сабралі матар'ял з фатаграфіямі і накіраваліся к шэфам.

Рэдактар пачаў адмаўляцца: «Мне няма часу і наўрад ці што выйдзе».

Дырэктар заводу тав. Левін проста лічыць, што выпускаць газэту непатрэбна: паперу пэцкаць.

І гэта гаворыць галава заводу. Вось прыклад як шэфы адносяцца да свайго падшэфнага эскадрону і як ацэньваюць нізавы, чырвонаармейскі друк.

Тут ня толькі недаацэнка друку, але недаацэнка значэньня пралетарскага шэфства над Чырвонай арміяй.

Алейчык.

Аднаразовы збор ідзе нездавальняюча

ЧАШНІКІ. (Пост «Зьвязды»). Раённыя арганізацыі аддаюць мала ўвагі мабілізацыі сродкаў. Амаль зусім бяздзейнічае калгасная сыстэма. Па ўступных узносах апошняя выканала свой плян толькі на 12,8 проц. Рэалізацыя абавязацельстваў Трактарацэнтру нават не распачалася.

З 4.800 руб., вызначаных студзеньскім заданьнем на ільна-канапляводчай кампаніі, на сёньняшні дзень не сабрана ні адной капейкі.

Рад сельсаветаў зусім ня цікавіцца мабілізацыяй сродкаў, і спадзяюцца выключна на самацёк. Так, Іваньскі сельсавет выканаў заданьне па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» толькі на 12,2 проц., Асташэўскі—на 20,5 проц. і г. д.

Па аднаразовым зборы заданьне выканана на мястэчку Чашнікі на 50 проц., затое па сельсаветах збор паступае вусім нездавальняюча.

Л. Стэрнін.

ВЫПУСЬЦІЦЬ ПАЗЫКУ „3-ці РАШАЮЧЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ"

Камвузаўцы падтрымліваюць ініцыятыву горлаўскіх рабочых

Студэнты прапагандысцкага аддзяленьня 3-га курсу Камуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя Леніна пастанавілі падтрымаць ініцыятыву горлаўскіх рабочых і прасіць урад СССР у бліжэйшы час выпусьціць пазыку «Трэці рашаючы год пяцігодкі».

Правесьцяная напярэдняя падпіска на пазыку дала каля 2 тыс. рублёў (100 проц. месячнай стыпэндыі).

Студэнты-прапагандысты 3-га курсу выклікаюць пасьледаваць свайму прыкладу ўсіх студэнтаў і выкладчыкаў Камвузу і ўсіх вышэйшых навучальных устаноў БССР.

РЫХТУЕМСЯ ДА ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Дом Чырвонай арміі праводзіць вялікую падрыхтоўчую работу да сьвяткаваньня гадавіны Чырвонай арміі.

Пры Доме будуць арганізаваны выстаўкі, якія адлюструюць гісторыю Чырвонай арміі і **баявую падрыхтоўку чырвонаармейскіх часьцей.** Лепшыя па баявой падрыхтоўцы часьці гарнізону будуць прэміраваны.

ДЧА абслужыць сваімі пастаноўкамі і канцэртамі часьці гарнізону, кадравы і запасны начскладзі.

Мяркуецца правесьці конкурс на лепшую песьню.

У Дом Чырвонай Арміі будуць наладжаны экскурсіі рабочых.

БДТ-1 --У ДАПАМОГУ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЕ

Калектыў артыстаў 1-га Беларускага Дзяржаўнага Тэатру прыме актыўны ўдзел у правядзеньні другой бальшавіцкай сяўбы. У калгасах і саўгасах Беларусі будуць наладжаны пастаноўкі тэатру.

Калектыў пастанавіў прысьвяціць гэтай справе адну дэкаду за кошт свайго летняга адпачынку.

Усе тэатры ,БССР павінны пасьледаваць прыкладу БДТ-1.

Ліквідацыя дзяржстраху

Згодна пастановы СНК і НКФ СССР, Дзяржстрах Беларусі ліквідуецца, уключаючыся ў Наркамфін БССР.

Для правядзеньня ліквідацыі створана камісія на чале з тав. Айзінсонам.

Ліст у рэдакцыю

У рэдакцыю «Зьвязды» паступіў ліст ад тав. Вінаградава, старшыні Слуцкага РВК.

Тав. Вінаградаў ацэнку яго дакладу на раённым зьезьдзе саветаў, даную ў карэспанденцыі тав. Грахнёва ў «Зьвязьдзе» ад 8 лютага пад назвай «Дзяліцкі даклад старшыні Слуцкага РВК ці яго правая практыка» прызнаў правільнай.

У сваім лісьце тав. Вінаградаў заяўляе, што дае бальшавіцкі абавязак у далейшым усімі сіламі змагацца за генэральную лінію партыі.

СЁНЬНЯ, а 8 гадз. вечч.
ЧАРГОВЫЯ ЗАНЯТКІ
АВІЯХІМАТРАДУ
імя 2-га Усебеларускага зьезду Асоавіяхіму
пры ЦП саюзу друкароў.
Яўка абавязкова.

Сёньня, 22 лютага г. г. роўна ў 7 гадз. вечара у памяшканьні кіно „Чырвоная Зорка"
адбудзецца
прысьвечанае дню XIII-й гадавіны Чырвонай арміі
ўрачыстае пасяджэньне
пленуму Менскага гарадзкога савету
сумесна з членамі ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, дэлегатамі Усебеларускага зьезду саветаў, членамі ЦВК, СНК, ЦСПСБ, гаркому КП(б)Б і ЛКСМБ з удзелам Чырвонай арміі і рабочых прадпрыемстваў гор. Менску.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР.
Члены і кандыдаты гарсавету, ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, дэлегаты Усебеларускага зьезду саветаў, ЦВК, СНК, члены прэзыдыуму ЦСПСБ, гаркому КП(б)Б і ЛКСМБ—праходзяць на прадпраўленьні сваіх мандатаў. Чырвоныя партызаны—на прадпраўленьні сваіх агульных партызанскіх пасьвечаньняў. Рабочыя, служачыя і чырвонаармейцы—па білетах, распаўсюджаных праз ЦСПСБ і начальніка гарнізону.
Менгарсавет.

Паведамленьні

— Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для правядзеньня дакладаў і мітынгаў па прадпрыемствах 25-га лютага—дня беспрацоўя. Пятушкоў, Гурыновіч, Мандрык—чыгунка, Рэмізэвіч, Лучышын (ВСНГ)—«Полымя рэвалюцыі», Танхілевіч, Гурэвіч—«Энэргія», Стракоўскі—«Бальшавік», Плешакоў, Ракаў—«Ударнік», Атульнік—абутк. ф-ка, Якаўлеў—пчочатчн. ф-ка, Анішчанка—пчацін. ф-ка, Будзінскі—«Камунар», Фрыдман—зав. «Д. А.», Жуковіч, Рудзіцкі—шклозавод, Лынько—зав. «Беларусь», Курцік—«Камунарка», Дунец, Шпэктараў—«Кастрычнік», Ошараў—«Беларуска», Тамашэвіч—скарняжн. ф-ка, Красіна—шпалерн. ф-ка, Ліанардо—«Чырв. Тэкстыльшч.», Гольдштэйн—Хлебазавод, Хацкевіч—Эльвод, Панкевіч—«Уціль», Білуга—ф-ка «Сакавіка», Некрашэвіч—друк. імя Сталіна, Дварэцкі—Белдзяржбуд, Кучынскі—Менбуд, Гольдрам—рымары, Яцкевіч, Белаш—Аўтакіраўніцтва, Гарбачоў—казан. прадпрыем. харчавікоў, Саевіч—«Чырв. Зорка», Мінц—малочны завод, Панкоў—Хладбойня, Верба—абутк. майст., Галаскок—Сьпіртзавод, Кіпко—каўбасн. ф-ка, Белашэўскі—Хэмфармзавод, Будзін—«Пралетары», Казючыц—«Чырв. Хэмік», Крываносаў—ф-ка імя Крупскай, Вашмачнікаў—УМТ, Юдэльзон—грузчыкі, Валасевіч—лямпавая ф-ка, Лойка—палата мер і вагі, Ніпенбойм—ЦПІ. Разарвнымі дакладчыкамі вылучаюцца г. т.: Югаў, Рыўкін, Гурвіч, Сэрбента, Хадасевіч, Модэль, Шэйнін, Хаскін, Кондраль, Рэвінскі, Жук, Кумкес. Усім т. т. зьявіцца 24-II-31 г., у 7 гадз. веч., у Дома Камасьветы, пакой № 19, на кансультацыю.

— Сьпіс дакладчыкаў, якія вылучаны гаркомам МОПР'у для правядзеньня мітынгаў 25-II-31 г. у міжнародны дзень барацьбы з беспрацоўем: Атрошка (курсы чырв. дырэкт.)—арт. «Энэргія», Аўпіўскі (курсы чырв. дырэкт.)—арт. «Уперад», Ардашнікаў (курсы чырв. дырэкт.)—арт. «Перамога», Карагеўскі (курсы чырв. дырэкт.)—арт. «Вата-Капат», Крутлікаў (курсы чырв. дырэкт.)—арт. «Спартак», Вунімаў (курсы чырв. дырэкт.)—арт. «Чырв. Друкар», Жукаў (курсы чырв. дырэкт.)—арт. галэін. «Новы Шлях», Валаняк (курсы чырв. дырэкт.)—арт. галэінт. «Новы шлях», Быкоўскі (курсы чырв. дырэкт.)—арт. «Чырв. лаечнік», Каган (курсы чырв. дырэкт.)—арт. «Чырв. Абутнік», Фінкельштэйн (курсы чырв. дырэкт.)—арт. «Пралетары», Сянкевіч (фінкурсы)—арт. шорнікаў, Шклаўс (фінкурсы) — арт. «Мэтраінструмант», Андруховіч (фінкурсы)—арт. «Труд—люстра», Каган (фінкурсы)—арт. «Чырв. агароднік», Лукемскі (фінкурсы)—арт. «Пралетары», Балтоўскі (фінкурсы)—арт. «Яднаньне», Васілеўскі (фінкурсы)—ЖАКТ № 1, Лісоўская (фінкурсы)—ЖАКТ № 2, Гсакаў (фінкурсы)—ЖАКТ № 3, Анісковіч (фінкурсы)—ЖАКТ № 4, Кантаровіч (фінкурсы)—ЖАКТ № 5, Гладкая (фінкурсы)—ЖАКТ № 6, Ліўшыц (фінкурсы) — ЖАКТ № 7, Плаўскі (палітэхн.)—ЖАКТ № 8, Каган (палітэхн.)—ЖАКТ № 9, Гінэбург (палітэхн.)—ЖАКТ № 10, Гродзкі (палітэхн.)—ЖАКТ № 11, Ямскі (рэд. газ. «Акцябр»)—ЖАКТ № 12, Гурэвіч (рэд. газ. «Акцябр»)—ЖАКТ № 13, Кабакоў (рэд. газ. «Акцябр»)—ЖАКТ № 15, Гофман (крама МЦРК № 199)—ЖАКТ № 16, Баран (ЦК МОПР'у)—ЖАКТ № 17, Каган (скарняжн. ф-ка)—ЖАКТ № 20, Вішнеўская (ЦКК РСІ)—ЖАКТ № 22, Плаўнін (рабфак)—варта МБВ, Рубінраўт (ЦСПСБ)—саюзскур, Панаў (НКАсьветы)—БСКА, Левін (ЦК МОПР'у)—страх каса інвалідаў, Шэрман (зав. «Бальшавік»)—праўленьне МЦРК, Барысевіч—(база МЦРК)—каўбасная ф-ка, Жалезіч («Чырв. тэкстыльшч.»)—Дом Ураду, Найштэйн (НКАсьветы)—Лесбел, Ягораў (шк. імя Чарвякова)—МК хатніх работніц, Панаў (падыд)—ФЗВ імя КІМ'у, Гурэвіч—МШВ таварыщ. Вортнікаў (стал. МЦРК)—ФЗВ пры зав. «Полымя рэвалюцыі», Вішнеўскі (паліводсаюз)—ф-ка «Кухня», Багаровіч.

— Дом Камасьветы. 22-II ад 7-9 гадз. індывід. кансультацыя па антырэлігійнай прапагандзе і індывід. кансультацыя па мэтаматыцы і фізыцы.

— БДУ. 22-II-31 г., у 8 гадз. веч., у 302 аўд.—агульны студэнцкі сход ф-ту саўбуду і права. Парадак дня: 1) Вынікі Усесаюзнай нарады па падрыхтоўцы кадраў сав. буд. і права, вынікі навучальнага паўгодзьдзя і задачы. 2) Аб формах і мэтадах працы ўдарных брыгад. 3) Рознае. Яўка ўсіх студэнтаў абавязкова. Запрашаюцца ўсе навуковыя працаўнікі.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.
Рэдакцыя і галоўная канторa
Менск, Савецкая, 33.
ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	10-74	Галоўная канторa	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі
(з дарожным дадаткам „Пра фуук")

На 1 мес.	— 3 р.
„ 3 мес.	— 9 „
„ 6 мес.	— 18 „
„ 12 мес.	— 36 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.
Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту—10 к., на старонцы абвестак—1 р. за радок. Пасьлядоўны тэксту—у два разы даражэй. Каштаваўзятны рахунак выдавецтва № 52|100501 у Дзяржбанку.
Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 33, 2-гі паверх тэл. 7-31.

Сёньня, 22 лютага. Пакуз для ф-кі „Кастрычнік" Пач. а 8 гадз.
Беларускі другі дзяржаўны тэатр
Е. Кіршон.
РЭЙКІ ГУДУЦЬ
П'еса ў 5 дзеях. 12 абразок.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
З прычыны выключнага посьпеху яшчэ тры дні! Гукавы фільм справа 13 ДЗЁН «ПРАМПАРТЫ»
ХРОНІКА СЮЗКІНО № 1 за 1931 г.
Каса—з 5 г.—Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура"
КІНО ЗАКРЫТА да 2 сакавіка.

КІНО „Інтэрнацыянал"
Новы савецкі фільм вытв. „Працкіно"
ЖАНЧЫНА Ў ЛЕСЕ
Пач. 1 сэансу ў 6 г.—Каса—з 4 г. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Апошнія 3 дні 16, 17 і 18 лютага
вастацкі фільм паводле раману ШОЛОМ-АЛЕЙХЭМА
МАБУЛ (Крывавы патоп)
драма ў 9 частках.
Пач. 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса—з 4 гадз.

Кіно „Юны Піянэр"
Два фільмы у 1 сэанс
1) ПРЫГОДЫ АРЫШКІ ў 5 частк.
2) Сенька Афыканец ў 2 частк.
Пач. сэансаў з 1 г. д. Каса—з 12 г.

КІНО „СПАРТАК"
2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі
ІГАР ІЛЬІНСКІ ў камэдыі
ЗАКРОЙШЧЫК з ТАРЖКА
ў 6 частках.
ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ
Пачатак: 1 с.—у 7 г. 2 с.—у 8 г. 15 м. 3 с.—у 9 г. 30 м. 4 с.—у 10 г. 45 м.
КАСА—з 5 гадз.

Цэнтральная камісія ЦКК РСІ
ПАЧЫНАЕ
АСАБІСТУЮ ЧЫСТКУ
ПРАЦАЎНІКОЎ АПАРАТУ БЕЛМЯСА.
Кампрамотуючыя матар'ялы, якія ёсьць, просьба накіроўваць у цэнтральную камісію, Менск, Рэвалюцыйная, 3.
Асабісты прыём ад 10 да 15 гадз. там-жа.
КАМІСІЯ.

ФЗВ абутнікаў імя Фабрыцыуса
(г. ВІЦЕБСК, Канатная, 1-18)
ПРАДАЕ:
1) 1 ДЫНАМО-МАШЫНУ 16½ к. с.—110 в., разьмеркавальная дошка да яе з прыладамі.
2) ЭЛЕКТРА-МАТОРЫ 11 к. с., 6 к. с. 2 к. с. і ½ к. с. пастаяннага току 110 в.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
АД ПАНЯДЗЕЛКА, 23 лютага
новы фільм
АПОШНІ БЭК
САЧЭЦЕ за РЭКЛЯМАЙ

ЦСПСБ і гарадзкая камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе
СКЛІКАЮЦЬ
24 лютага, у 7 гадз. веч., у клюбе Менскага гарадзкога савету
агульна-гарадзкі і раённы сход членаў нізавых камісій садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе
сумесна са старшынямі фабзаўмясцкомаў
на пытаньнях:
1) Аб ходзе выкананьня фінпляну ў 1-м квартале 1931 г. (дакл. старшыня цэнтральнай камісіі садз. пры прэзыдыуме ЦВК БССР т. Вансоўскі).
2) Аб перавыбарах камісій садзейнасьці і аб конкурсе спаборніцтва на лепшую пастаноўку работы нізавых камісій садзейнасьці (дакл. старшыня гарадзкой камісіі садзейнасьці тав. Каранеўскі).
У зьвязку з важнасьцю пытаньняў, яўка ўсіх членаў нізавых камісій садзейнасьці і старшынь фабзаўмясцкомаў абавязкова.
ЦСПСБ І МЕНГАРКАМСОД.

НА ГОМЕЛЬСКАЙ ГРЫБНОЙ БАЗЕ БЕЛСАДГАРОДНІНЫ
з 25-II—31 г. пачынаюць працу
МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ
па падрыхтоўцы кадраў грыбнікаў.
Просьба да ўсіх райспажтаварыстваў і райкопаў, якім прадстаўлены месцы на курсах цэнтральнымі кіраўніцтвамі Белкаапсаюзам і Белсадсаюзам, камандзіраваць да паказанага часу адпаведных асоб-слухачоў з ліку працаваўшых таварышоў па загатоўках у мінулым сезоне і актыву камсамольскай моладзі і калгасна-бядняцкага актыву моладзі. Просьба да райкомаў ЛКСМ дапамагчы райкопам у напрамку выдучэньня кандыдатур для паказаных курсаў.
Курсанты павінны мець пры сабе даведкі: аб сацстановішчы, праны, пэнсіі, і пасьцельныя прылады. Інтэрнат забясьпечан.
БЕЛСАДГАРОДНІНА.

Марына-Горскі с.-г. тэхнікум
абвяшчае, што з 25 студзеня па 15 сакавіка праводзіцца
прыём заяў на першы курс
Прымаюцца асобы ад 15 да 25 год.
Асобы, скончыўшыя поўны курс дасьвітагодавай працоўнай школы, школы II ст. і 2-гадовыя агульна-адукацыйныя курсы, сямігадовай працоўнай школы, школы для дарослых павышанага тыпу. ШКМ, с.-г. прафшколы і курсы па падрыхтоўцы ў т-мы, пры паступленьні ў т-м прымаюцца бяз іспытаў. Да заявы прыкладаюцца наступныя дакументы: 1) анкета па форме, устаноўленай для паступаючых у тэхнікумы, завераная прафсаюзным, або савецкімі арганізацыямі, 2) дакумант аб уроўневе (матрыка), 3) дакумант аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужч.). 4) дзьве фатаграфічныя карткі, 5) дакумант аб асьвеце, 6) медычнае пасьведчаньне аб стане здароўя, 7) дакумант аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, для калгаснікаў—даведка аб уступленьні ў калгас, для сялян—даведка с.-с. аб аплаце с.-г. падатку на 1931 год.
З 15 па 20 сакавіка будуць разглядацца заявы аб залічэньні, а з 1-га красавіка пачнуцца заняткі.
У веснавы набор будзе прынята 40 асоб. Прынятыя будуць забясьпечаны стыпэндыямі, згодна пастановы ўраду ад 16-X-30 г.
Заявы і дакументы накіроўваць па адрасе: ст. Пухавічы, Марына-Горскі с.-г. тэхнікум.
Дырэктар тэхнікуму С. А. ГЛУШАНОЎСКІ

Беларускаму жывёлагадоўчаму саюзу
„БЕЛЖЫВЁЛСАЮЗУ"
ПАТРЭБНЫ
інжынэр або тэхнік
знаёмы з С-ГАСПАДАРЧЫМ БУДАЎНІЦТВАМ
Аплата па згодзе.
Пісьмовыя і вусныя заявы накіроўваць: Менск, Белжывёлсаюз, Савецкая, № 46.

БЕЛРЫБА
паведамляе, што праводзіцца
ЧЫСТКА
ЯЕ АПАРАТУ.
Просьба да ўсіх рабочых і служачых
падаваць у камісію па чыстцы (Рэвалюцыйная вул. д. № 3) матар'ялы
што характарызуюць работу як усяго апарату Белрыбы ў цэлым, так і паасобных працаўнікоў.
КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.

МЕНГАРФА
ПАЦЬВЯРДЖАЕ, ШТО
УТРЫМАНЬНЕ АДНАРАЗОВАГА ЗБОРУ
з рабочых і служачых
павінна абавязкова праводзіцца пры выдачы зарплаты за першую палову лютага, сакавіка, красавіка і мая 1931 г.
ГАРФА.

АБВЯШЧАЕЦЦА КОНКУРС
на пасаду ардынатара
У 3-ай Мен. гар. сав. больніцы.
Заявы подаваць галоўнаму доктару
да 26 лютага г. г.

Камісія ЦКК НК РСІ па праверцы і чыстцы БАН
склікае сёньня, у 19 гадз., у анатамічным корпусе (Унівэрсытэцкі гарадок)
СХОД СТУДЭНТАЎ разам з рабочымі,
на якім будзе заслухана даклад катэдры антраполёгіі БАН.
На сход запрашаюцца навуковыя працаўнікі БАН, БДУ, дактары і настаўнікі.
Камісія ЦКК НК РСІ.

Пачалася
ЧЫСТКА
Белплодагароднины.
Просьба да ўсіх рабочых, служачых і устаноў даваць матар'ял на супрацоўнікаў Белплодагароднины камісіі па чыстцы апарату—Рэвалюцыйная № 3. Матар'ялы прымаюцца з 9 гадз. раніцы да 3 гадз. дня.
КАМІСІЯ.

АРШАНСКІ ТЭКСТЫЛЬНЫ ТЭХНІКУМ
АБВЯШЧАЕ ВЕСНАВЫ НАБОР
на 1-шы курс 120 асоб.
Заявы прымаюцца да 15-III-31 г.
Заняткі пачнуцца з 1-IV-31 г.
Правілы прыёму, згодна даведніка НКАБ.
65 проц. будзе забясьпечана стыпэндыяй і інтэрнатам.
Заявы накіроўваць па адрасе: г. Ворша, Тэкстыльны тэхнікум.
Нам. дырэктара Аляксейчык.

22-га лютага, у 7 гадзін вечара, у галоўным корпусе БДУ для выкладчыкаў рабфаку БДУ і студэнцкага актыву адбудзецца
даклад прафэсара ПАНКЕВІЧА
на тэму:
«КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА Ў ПЭДАГОГІЦЫ».
Запрашаюцца выкладчыкі і студэнцкі актыў усіх рабфакаў г. Менску.

фініш лыжных КАМАНД гораду пераносіцца на 24 лютага
і адбудзецца
ў часе дэманстрацыі фізкультурнікаў
на Пляцы Волі, роўна ў 5 гадзін вечара.
Бюро ФК ЦСПСБ.

Праўленьне МЦРК
— даводзіць да ведама ўсіх —
рабочых сьпісу № 1 і 2,
якія не посьпелі атрымаць новыя наборныя карткі
ПА СВАІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ, ШТО
з 21/II-31 г. абавязаны атрымаць кнiжкі
ў пункце МЦРК,
які зьмяшчаецца на рагу Козьма-Дзямянаўскай і пляц Волі, дзе раней знаходзілася 20-я крама МЦРК.